ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 38 (1675) | Пятніца, 11 мая 1962 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

НА ЎДАРНЫМ ФРОНЦЕ СЯМІГОДКІ

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ АБ ТЭАТРАЛЬНЫМ МАСТАЦТВЕ

ДА 80-годдзя з дня нараджэння Я. КУПАЛЫ і Я. КОЛАСА

ТВОРЧАСЦЬ САМАДЗЕЙНЫХ КАМПАЗІТАРАЎ

АПАВЯДАННЕ В. ЭГЕРАТА

Беларуская літаратура ў Чэхаславакіі



На плошчы Перамогі ў Мінску 9 мая. Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

У ГОНАР ДНЯ ПЕРАМОГІ

Працоўныя нашай краіны шырока адзначылі Дзень перамогі.

Урачысты вечар, прысвечаны 17-й гадавіне перамогі над фашысцкай Германіяй, адбыўся ў сталіцы нашай Радзімы Маскве, у Калоннай зале Дома Саюзаў. З вялікім уздымам прысутныя выбіраюць ганаровы прэзідыум у складзе Прэзідыума ЦК КПСС на чале з М. С. Хрушчовым. Вечар адкрыў Маршал Савецкага Саюза В. Д. Сакалоўскі.

Успамінамі аб неўміручых подзвігах нашых воінаў у гады Вялікай Айчыннай вайны падзяліліся на вечары Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік артылерыі ў адстаўцы Н. М. Хлебнікаў, Героі Савецкага Саюза Н. В. Папова, В. В. Паўлаў і І. І. Бачароў, палкоўнік запасу І. Ф. Хоміч. З прывітальнымі словамі да прысутных і ў іх асобе да ветэранаў вайны і воінаў Савецкай Арміі выступіў сакратар МГК КПСС А. Е. Бірукоў.

З вялікім уздымам удзельнікі вечара прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

Урачыста адзначылі Дзень перамогі працоўныя Беларусі. У рабочых клубах шматлікіх прадпрыемстваў, у хатах-чытальнях і дамах культуры адбыліся вечары, прысвечаныя неўміручаму подзвігу савецкага народа. Бібліятэкі рэспублікі наладзілі выстаўкі, вітрыны, мантажы аб слаўнай гадавіне.

У сталіцы рэспублікі тысячы працоўных прыйшлі ў гэты дзень на плошчу Перамогі і ўсклалі вянкі да падножжа помніка-абеліска воінам і партызанам.

Увечары ў майскае неба сталіцы ўзвіліся каляровыя агні салюту ў гонар гістарычнай перамогі.

ПАДАРУНАК МУЗЕЮ

У Мінску знаходзіцца адзіны ў нашай краіне Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У ім сабрана шмат экспанатаў, якія сведчаць аб гераічнай барацьбе савецкага народа супраць гітлераўскіх захопнікаў.

У гэтыя дні ў музеі людна. Сюды прыходзяць рабочыя, калгаснікі, воіны Мінскага гарнізона, шматлікія госці Беларусі. Экскурсаводы расказваюць наведвальнікам пра подзвіг воінаў Савецкай Арміі ў справе разгрому захопнікаў, пра партызанскі рух у рэспубліцы.

Нядаўна ў музеі выстаўлен яшчэ адзін экспанат — невялічкі бюст Уладзіміра Ільіча Леніна. Гісторыя яго такая. У 1941 годзе жыхарка вёскі Забалацце Аршанскага раёна Аляксандра Кірылаўна Шчэрба схавала бюст Ільіча, які знаходзіўся ў адным з пакояў сельсавета. Амаль чатыры гады яна беражліва захоўвала дарагую рэч. У дзень вызвалення вёскі ад ворага яна прынесла бюст у сельскі Савет. Нядаўна работнікі сельсавета перадалі бюст Ільіча на захаванне ў музей.

ПОДЫХ ВЯСНЫ І ЧАСУ

Прыгожа раніцай на Сожы. Здаецца, што ўночы тут гарэла мноства вогнішчаў і дым ад іх зараз сцелецца берагам ракі. З таго берагу ўзыходзіць сонца і прасвечваецца нібы праз дымавую заслону, праменні яго ледзь прабіваюць густую тоўшчу туману. Клубы лёгкай пары ўзнімаюцца і з палетку, што распасцёрся непадалёк ад ракі.

— Дыхае зямля,— гаворыць Уладзімір Аляксеевіч Кончыц, агранам калгаса «Кастрычнік» Веткаўскага раёна, з якім мы аглядаем палі, цікавімся працай механізатараў.— На поўныя грудзі дыхае, — пасля некаторай паўзы дадае ён.

Сонца падымаецца вышэй. Туман паступова растае. І, нібы выхваляючыся сваёй прыгажосцю, заблішчала люстраная гладзь вады, пераліваючыся пад праменнямі ранішняга сонца. Недзе там, на лузе, азвалася запозненая качка. Высока ў небе над полем зазвінеў жаўранак. Але звон яго патанае ў рокаце матораў. Відаць, раней яго падняліся калгасныя механізатары. Пэўна, да спадобы хлебаробам сустракаць сонца ў полі.

Так, не «адпачываюць» сталёвыя коні ў калгасе ў такі адказны веснавы час. Дзень і ноч яны працуюць — уначы рыхтуюць глебу, а ўдзень сеюць ярыну, развозяць і раскідваюць угнаенне, каб затым яго заараць. Нядоўгая перадышка бывае тады, калі мяняюцца змены. Кароткая размова, тэхагляд, праверка асноўных вузлоў агрэгата, іх работы — і трактар зноў ідзе ў баразну.

Якраз і сустрэліся ў такі час мы з трактарыстамі Іванам Готавым і Мікалаем Шатанавым. Першы працаваў у начную, другі станавіўся на яго месца.

— Ну як, ніякіх непаладкаў не было? — запытаў Мікалай Шатанаў у свайго напарніка.

— Сам бачыш, — задаволена адказаў той і рукой паказаў на палетак.

Участак гектараў на восем, толькі што ўзараны, дыміўся пад праменнямі сонца.

— Што ж, пастараюся і я так трымаць, — з гэтымі словамі Мікалай Шатанаў ірвануў за рамень, і цішыню парушыў прарэзлівы рокат пускавога маторчыка. Але вось трактар запрацаваў глуха і паважна, а потым рушыў наперад, пакідаючы за сабой шырокі чорны след.

Так трымаць! Працаваць так, каб своечасова пасеяць яравыя, а пасля арганізаваць узорны догляд пасеваў, — з такой думкай працуюць хлебаробы калгаса. І ў авангардзе барацьбы за высокі ўраджай, як правіла, ідуць механізатары.

Недалёка ад вёскі Шарсцін на ўчастку першай паляводчай брыгады сеюць кукурузу трактарысты Максім Шаўцоў і Сямён Зыкаў. Тут жа знаходзіцца і брыгадзір Сяргей Іванавіч Старавойтаў. Разам з агранамам яны правяраюць, як захінаецца глебай насенне, ці атрымліваюцца правільныя квадраты.

— Усё ў парадку, — канстатуе Уладзімір Аляксеевіч.

А інакш і быць не магло. Усе члены чатырох звенняў, якія будуць вырошчваць сёлета ў гаспадарцы кукурузу на плошчы 275 гектараў, зімой прайшлі спецыяльную падрыхтоўку, адрамантавалі і прывялі ў баявую гатоўнасць тэхніку. Кожнаму звяну прыданы трактар «Беларусь», кукурузная

З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

сеялка, культыватар і іншы неабходны прычэпны інвентар. На рукі кожнаму звеннявому праўленне арцелі выдала аграпашпарт. У ім, у прыватнасці, запісана, дзе і ў якія тэрміны трэба сеяць кукурузу, якія агратэхнічныя работы трэба выканаць на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду, якая вызначана аплата кукурузаводам за атрыманне правільных квадратаў, за ўзорны догляд пасеваў, за дасягненне планавай і звышпланавай ураджайнасці, колькі ўгнаення пакладзена на той ці другі ўчастак. Не мала. На кожны гектар заарана ўжо ў сярэднім па 35 тон торфагноевага кампосту.

— Аграпашпарты для нас — своеасаблівыя компасы, — гавораць механізатары. — Яны і падганяюць нас і адначасова прымушаюць сачыць за якасцю выкананай работы. Ад гэтага ж залежыць і аплата нашай працы.

У якую б брыгаду ні наведаўся, куды б ні завітаў у калгасе, усюды натхнёна працуюць людзі.

— Вясна для нас сёлета асаблівая, — гавораць яны. — Гэта першая вясна пасля XXII з'езда партыі і сакавіцкага Пленума ЦК КПСС.

І сапраўды, сёлета вясна асаблівая для хлебаробаў рэспублікі. На змену травапоўля на нашы палі прыйшлі прапашныя культуры. Усюды пашыраны пасевы кукурузы, цукровых буракоў, бабовых. Каб дабіцца рэзкага павелічэння прадуктаў жывёлагадоўлі і паляводства, калгасы і саўгасы сёлета робяць асноўную стаўку на гэтыя тры кіты, на тры асноўныя кармавыя культуры.

Праўда, пашырэнне пасеваў прапашных патрабуе і большай стараннасці, большага напружання. І хоць вясна была зацяжной, хлебаробы навучыліся абганяць час, працаваць так, каб ён адступаў перад імі.

Іменна так і працуюць трактарыст Іван Смірноў і Генадзь Жыгалка з калгаса «Бальшавік» Ваўкавыскага раёна. Ранняй вясной, рыхтуючы глебу пад яравыя, яны на трактары «ДТ-54» у счэпе з двума культыватарамі за дзве змены праводзілі культывацыю глебы на плошчы 60 гектараў. Працуючы пасля на ворыве, механізатары кожны дзень перавыконваюць зменныя заданні пры захаванні высокай якасці.

Хіба Генадзь Жыгалка і Іван Смірноў выключэнне? Так у калгасе працуюць усе механізатары, усе паляводы.

А ўзяць саўгас «Гнезна» таго ж раёна. Толькі кукуруза сёлета тут займае 1110 гектараў ды 450 гектараў цукровых буракі. Колькі працы спатрэбіцца, каб пасеяць, апрацаваць і ўбраць толькі гэтыя культуры! І за вырошчванне іх узяліся саўгасныя механізатары. Каля 70 трактараў з самай вясны выйшла на палі ў саўгасе. Дзякуючы таму, што трактары працуюць у дзве змены, гаспадарка паспяхова завяршыла сяўбу ранніх яравых, цяпер шырокім фронтам вядзе сяўбу кукурузы і пасадку бульбы.

— Сёлета, як ніколі, працуюць нашы хлебаробы,— гаворыць начальнік Ваўкавыскага тэрытарыяльнага калгасна-саўгаснага ўпраўлення Васіль Пятровіч Капцелаў.— Многа дапамагаюць ім на месцах спецыялісты нашага ўпраўлення.

У час пасеяць. Гэтым жыве сёння і звеннявы механізаванага звяна па вырошчванню кукурузы Іван Парда з калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Лельчыцкага раёна. Яго звяно вырошчвае сёлета «каралеву палёў» на плошчы 100 гектараў, у тым ліку трыццаць пяць гектараў на зерне. Атрымаць з кожнага гектара не менш 400 цэнтнераў кукурузы з пачаткамі ў малочна-васковай спеласці і 30 цэнтнераў зерня — такое абавязацельства механізатара. На заваяванне яго і вывеў ён свой трактар на палетак. Сяўба ідзе паспяхова.

— Ураджай будзе! — так гаворыць Іван Парда.

І чамусьці зноў успамінаюцца словы агранома Уладзіміра Аляксеевіча Кончыца:

— Дыхае зямля... На поўныя грудзі дыхае...

Так, дыхае зямля, дае свае жыватворныя сокі раслінам.

Дыханнем вясны, дыханнем нашага часу напоўнены сёння будні хлебаробаў.

Ул. ПРАВАСУД.

Чацвёртая традыцыйная

Учора ў Мінску, у памяшканні Саюза пісьменнікаў БССР пачала работу IV традыцыйная міжрэспубліканская тэатразнаўчая канферэнцыя Прыбалтыкі і Беларусі.

Напярэдадні гэтага крытыкі, тэатразнаўцы і творчыя работнікі Латвіі, Літвы, Эстоніі і Беларусі пазнаёміліся з новымі спектаклямі ў тэатрах чатырох братніх рэспублік.

Канферэнцыю адкрыў міністр культуры БССР Р. Кісялёў. На парадку дня яе работы — праблема канфлікту ў сучаснай драматургіі і яго сцэнічнага ўвасаблення: даклады старшыні секцыі крытыкаў Латвійскага тэатральнага таварыства Ю. Паберзса, кандыдата філалагічных навук І. Ланкуціса (Літоўская ССР), кандыдата мастацтвазнаўства К. Каськ (Эстонская ССР), кандыдата мастацтвазнаўства Ул. Няфёда (Беларуская ССР).

Канферэнцыя працягнецца да 12 мая г. г. На ёй прысутнічаюць прадстаўнікі Усерасійскага тэатральнага таварыства — доктар мастацтвазнаўства Г. Гаян, кандыдат мастацтвазнаўства Ул. Фралоў, Адбудзецца абмеркаванне дакладаў і абмен думкамі па прагледжаных спектаклях.

На сцэне Крамлёўскага тэатра

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача выехаў у сталіцу нашай Радзімы Маскву для ўдзелу ва Усесаюзным фестывалі тэатраў юнага гледача, прысвечаным 40-годдзю піянерскай арганізацыі імя Ул. І. Леніна. На сцэне Крамлёўскага тэатра будуць паказаны спектаклі па п'есах «Рэвізор» М. Гогаля і «На граніцы» В. Белазёрава.

ПАРОЛЬ ПАЭЗІІ

Расказвае галоўны рэдактар зборніка «Дзень паэзіі 1962» Міхаіл ЛУКОНІН

На агульным сходзе маскоўскіх паэтаў абмяркоўваўся праект зборніка «Дзень паэзіі. 1962». Карэспандэнт агенцтва друку Навіны Р. Анісімаў звярнуўся да галоўнага рэдактара зборніка паэта М. Луконіна з просьбай расказаць пра будучую кнігу.

— Калі мы задумвалі першы зборнік «Дзень паэзіі» ў 1958 годзе, — сказаў Міхаіл Луконін,— паэзію справядліва крытыкавалі за адставанне ад жыцця, за схематызм. За гэтыя гады змянілася вельмі многае. Гарачая цікавасць да паэзіі цяпер бясспрэчная.

Усё гэта ўскладае на нас асаблівую адказнасць. Зборнік «Дзень паэзіі» 1962 года задуманы, як правобраз «Часопіса паэтаў». Хочацца, каб ён не паўтараў папярэднія выданні. Вось чаму, апроч падборак і асобных вершаў, мы думаем змясціць рэцэнзіі на новыя кнігі і «антырэцэнзіі».

У кнізе будуць раздзелы «Новыя вершы», «Жывая хроніка», «З запісных кніжак паэтаў», «Палеміка», «Дэбюты маладых». Увойдуць у выданне і сатырычныя вершы, пародыі, эпіграмы. Мы таксама пазнаёмім чытача з паэтамі саюзных рэспублік, змесцім пераклады з зарубежнай паэзіі.

Я не сумняваюся, што ўсе творы, якія ўвойдуць у зборнік «Дзень паэзіі» гэтага года, будуць паэтычным адказам на жыццёва важныя праблемы нашай рэчаіснасці. У зборніку будуць прадстаўлены паэты розных пакаленняў — і тыя, хто ўвайшоў у літаратуру на заранку Існавання Савецкай дзяржавы, і тыя, чый голас чытачы пачулі зусім нядаўна. Маладая савецкая паэзія цяпер вельмі цікавая. Яна развіваецца разумна, вызначаецца вялікім густам да навізны, да пошукаў. Савецкай паэзіі заўсёды былі ўласцівыя жыццёвасць, паглыбленая цікавасць да чалавека, да карэнных пытанняў сучаснасці. У паэзіі не выключана магчымасць сустрэчы з эпігонамі і пераймальнікамі, але я глыбока перакананы, што ў наш час проста немагчымы паэт-адзінотнік, раўнадушны да ўсяго, што яго акружае.

Радуе цікавасць маладых паэтаў і да формы. Прыгожа сталі пісаць у нас! Праўда, часам, розныя прыгажосці формы адбіваюцца на ўнутранай сіле верша, але ніхто не будзе адмаўляць, што ў павышэнні агульнага тонусу савецкай паэзіі многа зрабілі маладыя паэты. «Маладая» паэзія ўзнікла не сама па сабе. Яна была падрыхтавана ўсім ходам развіцця савецкай літаратуры. Здаровыя традыцыі адчуваюцца ў творчасці таленавітых паэтаў Белы Ахмадулінай, Уладзіміра Цыбіна, Уладзіміра Фірсава, Мікалая Благава, Мікалая Анцыферава. Я ўжо не гавару пра Яўгенія Еўтушэнку і Андрэя Вазнясенскага, якія сталі прызнанымі майстрамі.

Мне здаецца, што ў далейшым у нашай паэзіі будзе яшчэ большая разнастайнасць формы. Пурытанізм формы адпадае ўжо на нашых вачах.

— Маё пакаленне паэтаў, як і цяперашняя моладзь, — сказаў у заключэнне Луконін, — нямала папрацавала над разбурэннем кананічнага верша, але да гэтага часу і, думаю, на будучае застаюцца ў сіле словы Пушкіна, які пісаў, што паэзіі, вызваленай ад умоўнасці вершаскладання, мы яшчэ не ведаем...

...Міхаіл Луконін — паэт ваеннага пакалення. Яго першая кніжка вершаў згарэла ў жніўні сорак другога года пад той самай бамбардзіроўкай, якая спыніла жыццё яго маці. Кніга была ў друкарні, лісты яе разнесла гарачым ветрам выбухаў.

Праз шмат гадоў Луконін даў сваёй новай кнізе назву той, першай — «Вершы дальняга следавання».

Думаецца, што гэтую назву смела можна даць усёй паэзіі нашых дзён. Яна таксама ў дальнім следаванні. Яе маршрут той жа, што і ўсяго савецкага народа. Яе пароль — вясна!

АДН.



Полацкі нафтаперагонны — найвялікшая будоўля сямігодкі. На тысячы кіламетраў, праз усю краіну працягнуліся сталёвыя артэрыі, па якіх прыйдзе сюды «чорнае золата». А на заводзе поўным ходам ідзе мантаж абсталявання. Вось і кампрэсарны цэх забяспечваецца навейшым абсталяваннем, рыхтуецца ўступіць у строй.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

ГАНЬБА АТАМНЫМ ВАР'ЯТАМ!

Па зямлі ідзе вясна. Дзяўчаты з зеленгаса ў каляровых хусцінках садзяць уздоўж Ленінскага праспекта браткі. Ужо трэснулі пупышкі і маладое лісце цягнецца да сонца, а карэнні... карэнні дзесьці глыбока пад зямлёю аблыталі абломкі руін і іржавага жалеза, што яшчэ ляжаць там з вайны.

Вясна, блакітнае неба, усмешкі. І цень кладзецца на твары, і іншыя кветкі, сплеценыя ў вянкі, кладуцца на гранітныя пліты помніка Перамогі. І позіркі гнеўныя, як ніколі, і словы суровыя і поўныя абурэння: там, над акіянам расцвітаюць іншыя кветкі — страшэнныя кветкі смерці, і зямля скаланаецца ад ядзерных выбухаў.

Раніцаю газеты прыносяць весткі жыцця — у трубку пайшлі азімыя, у семнаццаты раз праворваюць акопы лемяхі, перакаваныя з мячоў. Мы семнаццаць гадоў памятаем гэтыя акопы...

Раніцаю газеты прыносяць весткі смерці — працягваюцца выпрабаванні ядзерных бомб, працягваюцца злачынныя выбухі пад зямлёю і ў паветры, блакітным паветры вясны.

І побач са зводкамі з палёў — пратэсты, пратэсты, пратэсты, з усяго свету. Пратэстуюць Гавана і рабочы Парыж, пратэстуюць Сафія і Масква, пратэстуюць працоўныя Беларусі, старыя партызаны і моладзь, рабочыя і служачыя, пенсіянеры і школьнікі, пратэстуюць супраць тых, хто ўхіляецца ад мірных перагаворaў, хто хоча грукатам выбухаў заглушыць голас чалавецтва, голас жыцця і вясны.

«Мы патрабуем у імя жыцця і будучыні юнацтва спыніць ядзерныя выбухі пад зямлёю і ў атмасферы, пакласці канец падрыхтоўцы ядзернай вайны, знішчыць запасы атамнай і вадароднай зброі.

Мы ўпэўнены, што людзі добрай волі, міралюбівыя сілы спыняць руку тых, хто бразгае атамнай зброяй.

«Ганьба амерыканскаму імперыялізму!», «Ганьба Кенедзі!», «Далоў ядзерную зброю!» — гэтыя словы сёння скандуе моладзь Беларусі на сваіх мітынгах, вечарах, сходах».

Подпіс — Камітэт маладзёжных арганізацый БССР.

«Сёння нашы пачуцці, наша сумленне кіпяць гневам і нянавісцю супраць ворага ўсіх народаў — амерыканскага імперыялізму, які рыхтуе тэрмаядзерную вайну.

Далоў выпрабаванне ядзернай зброі!

Ганьба амерыканскаму імперыялізму!

Ганьба Кенедзі!» — заяўляе ў сваім пратэсце ад імя камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат Беларусі Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ.

Да міжнароднага рабочага класа звяртаюць свой заклік працоўныя рэспублікі ў заяве Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў, заклік, каб працоўныя масы, усе людзі добрай волі яшчэ цясней згуртавалі свае рады, каб аб'яднаныя намаганнямі паклалі канец тэрмаядзерным выбухам, сарвалі чалавеканенавісніцкія планы імперыялістычных агрэсараў.

«Аднавіўшы ядзерныя выпрабаванні, урад ЗША зрабіў правакацыйны выклік усім народам, — гаворыцца ў гэтай заяве. — Гэтыя выпрабаванні маюць на мэце ўзмацненне гонкі ўзбраенняў і абвастрэнне міжнароднага становішча, яны пагражаюць здароўю і бяспецы працоўных усяго свету».

Вясна ідзе па зямлі — вясна абнаўлення і надзей, вясна згуртаванасці працоўных усяго свету і ўсяго чалавецтва вакол ідэі міру. Вясна пераможа!

ЧАМУ Ж АДСТАЕ ОПЕРА?

Працягваем размову аб тэатральным мастацтве.

Сёння мы друкуем артыкул пісьменніка А. Бачылы. Наступнае слова — музычнаму крытыку Д. Жураўлёву.

Алесь БАЧЫЛА

На старонках нашага друку за апошні час усё часцей абмяркоўваюцца праблемы сучаснай савецкай оперы. Гэта добра. Пара, нарэшце, ад агульных заклікаў аб неабходнасці стварэння сучаснай оперы перайсці да сапраўднага разгляду прычын адставання гэтага жанра.

...Я ўжо даўно заўважыў такую акалічнасць: як толькі з'яўляецца ў свет слабы твор, дык адразу пішацца на яго столькі рэцэнзій, што імі хоць грэблю масці. У той жа час значна менш з'яўляецца рэцэнзій на твор самабытны, арыгінальны, новы па матэрыялу і вырашэнню, пры разглядзе якога патрэбна выявіць свой густ, свае эстэтычныя погляды і даць абгрунтаваную ацэнку. Відавочна, каб заўважыць новае ці першыя, нават яшчэ нясмелыя, яго парасткі, трэба мець не толькі добрае мастацкае чуццё, але і быць па-сапраўднаму зацікаўленым у адкрыцці гэтага новага. З якой удзячнасцю ўспамінаем мы цяпер многіх вялікіх крытыкаў мінулага таму, што яны ў свой час смела адкрывалі новыя невядомыя імёны. І як шкада, што ў нас такіх крытыкаў цяпер вельмі мала.

Відаць, у крытыцы, якая павінна быць заўсёды наперадзе, дае сябе адчуваць скаванасць мыслення, прыхільнасць да ўжо гатовых схем, як спадчына таго часу, калі ўсе ацэнкі даваліся толькі ў катэгарычнай форме. Некаторым і цяпер ўяўляецца, што дзвюх супрацьлеглых думак, дзвюх розных ацэнак твора існаваць не можа.

Адсутнічае сапраўдная зацікаўленая крытыка, глыбокая і грунтоўная, доказная і справядлівая, якая б сваёй бескарыслівай увагай і дасканалым аналізам садзейнічала фарміраванню самага складанага музычнага жанра — операнага. Адразу ж хочацца нагадаць тут словы вялікага рускага пісьменніка Льва Талстога, які гаварыў:

«Значэнне крытыкі ў тым, каб адзначаць усё тое добрае, што ёсць у тых ці іншых творах мастацтва, і кіраваць такім чынам думкаю публікі, густы якой у большасці грубыя і большасць якой не чулая да прыгожага.

... Асабліва бессэнсоўны і танны звычай крытыкаў выказваць адносна чужых твораў усе свае думкі, якія маюць з імі малую сувязь; гэта самая бескарысная балбатня».

Дарэчы, такая балбатня яшчэ не вывялася і цяпер. Аўтары асобных артыкулаў нават і не ставяць перад сабой задачы раскрыць аўтарскую задуму, глыбока прачытаць твор і паказаць яго станоўчыя і адмоўныя бакі. Звычайна такі крытык імкнецца навязаць аўтару сваю волю і, зыходзячы з таго, як яму хацелася б бачыць вырашэнне той ці іншай тэмы, і разглядае твор аўтара. А ў выніку — яго аналіз не толькі не дае аб'ектыўнай ацэнкі твора, але і дэзарыентуе самога аўтара. Ні для каго не сакрэт, што адна і тая ж тэма не можа быць аднолькава ўбачана некалькімі сапраўднымі мастакамі. Кожны яе вырашыць пасвойму.

Творчасць таму і называецца творчасцю, што ніколі не робіцца па загадзя вядомых рэцэптах ці ўзорах. Эталонаў тут няма і быць не можа. Кожны раз гэта «язда ў нязведанае». Адзінае, што можа служыць компасам у такой яздзе — правільнае разуменне ідэй і задач часу, канкрэтнае і глыбокае веданне той галіны жыцця, якая з'яўляецца аб'ектам адлюстравання.

У апошні час нават можна пачуць выказванні (са спасылкамі на факты шматлікіх творчых няўдач), што нібыта опера, як жанр, непрыдатная для паказу сучаснага жыцця, што яна аджыла ўжо свой век, а таму, маўляў, не варта і клапаціцца аб яе развіцці. Скажам адразу, выказванні больш чым дзіўныя. Оперны жанр не аджыў свой век. Яму, як і многім іншым музычным жанрам, наканавана доўгае жыццё. Аджылі толькі атрыбуты старой оперы. Тут, як і ў кожнай іншай справе, трэба ўмець своечасова ўбачыць парасткі новага і заўважыць тое, што ўжо стала тормазам далейшага развіцця. Практыка паказвае, што ніводзін жанр мастацтва не стаіць на месцы, ён увесь час мяняецца, як мяняецца і само жыццё, і эстэтычныя крытэрыі і запатрабаванні народа. Не ўлічваць гэтыя змены — значыць быць неаб'ектыўнымі суддзямі.

Нядаўна я прачытаў у газеце «Літаратура і мастацтва» артыкул Л. Александроўскай «На опернай сцэне». У ім старэйшы майстар оперната мастацтва выказвае шмат слушных думак. Асабліва каштоўныя канкрэтныя заўвагі пра работу акцёра-вакаліста над роллю, прапановы аб паляпшэнні выхавання маладых кадраў спевакоў, якім належыць стварыць яркія вобразы нашых сучаснікаў. Усе гэтыя парады, вядома, прынясуць немалую карысць тым, хто працуе на опернай сцэне. Аднак артыкул, асабліва першая яго частка, не адказвае на многія пытанні, пастаўленыя самім жа аўтарам. І не адказвае не выпадкова. Паспрабуем коратка ва ўсім разабрацца.

Якія ж гэта пытанні? Паколькі іх добра сфармулявала сама Л. Александроўская, я прывяду цытату. Вось яна:

«Чаму на нашых спектаклях гледачу часта бывае сумна? Чаму ён не хвалюецца? Чаму не заўсёды яго кранаюць вобразы оперных герояў?»

І, сапраўды, чаму? Каму ж, як не старэйшаму майстру опернай сцэны, трэба было паспрабаваць разабрацца ў гэтых пытаннях? Гэта прыўдзеле Л. Александроўскай і на яе вачах ажыццёўлена пастаноўка чатырнаццаці оперных і балетных спектакляў. Матэрыялу для аналізу і вывадаў больш чым дастаткова. Аднак, у артыкуле гэты матэрыял не выкарыстаны таму, што тады трэба было б гаварыць не толькі пра здабыткі, вартыя далейшага развіцця. Справа ў тым, што наш оперны тэатр многія гады не меў сапраўднай рэжысуры, сапраўднага неспакойнага мастацкага кіраўніцтва, якое б шукала і новыя тэмы, і новыя формы, і новыя сучасныя праблемы, выражаныя опернымі сродкамі. Нашу рэжысуру вель-

[Заканчэнне на 3-й стар.].

Працоўныя рэспублікі шануюць памяць сваіх народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Іх імёнамі названы бібліятэкі рэспублікі, калгасы, культурна-асветныя ўстановы. Адна з прыгажэйшых вуліц Мінска носіць імя Янкі Купалы.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

АМАТАРЫ І ІХ ШЭФЫ

У апошні час у рэспубліцы паспяхова развіваецца новая галіна народнай музычнай творчасці — кампазітарская самадзейнасць. Яна ўжо зрабілася сталай галіной самадзейнага мастацтва. Музыканты-аматары, якія спрабуюць сілы ў кампазіцыі, уносяць прыкметны ўклад у скарбніцу беларускай культуры. Дзякуючы іх творчасці народна-песеннае мастацтва вабывае новыя рысы.

Побач з вядомымі ў нас імёнамі — П. Шыдлоўскага, П. Касача, П. Шаўко — гэтай «старой гвардыі» народных стваральнікаў песень, вырасла новае пакаленне самадзейных аўтараў музыкі, якія настойліва займаюцца павышэннем свайго майстэрства пры абласных дамах народнай творчасці.

Многія беларускія прафесіянальныя кампазітары шэфствуюць над асобнымі групамі народных складальнікаў песень, выязджаюць у абласныя гарады для правядзення практычных семінараў і метадычных кансультацый з аматарамі. Такая творчая садружнасць прадстаўнікоў прафесіянальнай і народнай музычных культур — з'ява зусім новая ў нашым жыцці, немагчымая для часоў традыцыйнага фальклору. Безумоўна, перад шэфамі-прафесіяналамі стаяць значныя цяжкасці. Бо склад самадзейных аўтараў па сваёй музычнай і агульнай адукацыі — вельмі неаднародны. Сярод самадзейных кампазітараў сустракаюцца і людзі, якія скончылі музычныя вучылішчы, школы, і якія атрымалі пачатковыя веды па музыцы на розных семінарах і курсах, і, нарэшце, тыя, хто ўвогуле не знаёмы з нотнай граматай.

Зразумела, што і мастацкія мэты і задачы ў гэтых аўтараў — не аднолькавыя. Адны з іх пішуць простыя песні ў традыцыйным стылі, другія спрабуюць свае сілы ў стварэнні розных «варыяцый» для музычных інструментаў, канцэртных полек, вальсаў і г. д. У гэтым няма нічога благога. Сучасная народная творчасць тым і адрозніваецца ад дарэвалюцыйнага фальклору, што яна, нарэшце, вырвалася на шырокі прастор інтарэсаў прафесіянальнага мастацтва і перад ёю адкрыліся невядомыя дагэтуль далі мастацкага самавыяўлення не толькі ў жанры традыцыйных песень (вясельных, лірычных, вяснянак), але і ў жанры раманса, вальса, прэлюдыі, песні-рэчытатыву. Музычная самадзейнасць ва ўсім хоча выпрабаваць свае сілы. Гэта зусім аб'ектыўны і заканамерны працэс. З аднаго боку, ён выклікае да сябе спачувальнае стаўленне, а з другога — насцярожвае імкненнем адразу ахапіць неабсяжнае, несвядомым ці наўмысным адмаўленнем ад народных традыцый.

Справа ў тым, што народнае музычнае мастацтва пакуль яшчэ ясна не ўстанавіла свайго творчага напрамку, не замацавалася стылістычна і нават арганізацыйна. Часам наогул бывае цяжка ўявіць сабе творчае аблічча таго ці іншага музыканта-аматара. І вось тут вялікая роля належыць нашым прафесіянальным дзеячам музыкі. Яны павінны раскрыць індывідуальнасць кожнага самадзейнага аўтара, дамагчыся, каб ён вызваліўся ў сваёй творчасці ад усялякіх наносных і бесперспектыўных уплываў (а іх яшчэ нямала ў самадзейнасці). Трэба ўмець працаваць з таленавітымі людзьмі з такой жа ахвотай і зацікаўленасцю і так старанна, як гэта робіць мастацкі кіраўнік Беларускага народнага ансамбля песні і танца, вядомы музыкант-этнограф Г. Цітовіч.

На жаль, некаторыя прафесіянальныя кампазітары свой абавязак памагаць народным песеннікам разумеюць вельмі прымітыўна: проста бяруць і цалкам апрацоўваюць мелодыі «падшэфных». Пра гэта сведчаць многія песні самадзейных аўтараў, змешчаныя ў зборніках, якія выйшлі ва ўсіх абласцях. Бадай, толькі ў віцебскім зборніку «Песні над Дзвіною», у першым яго радзеле, можна знайсці ўзоры арыгінальнай творчасці. Ва ўсіх астатніх зборніках мы маем справу або з своеасаблівым сааўтарствам, сумеснай творчасцю аматара і прафесіянала, або ўвогуле з творам прафесіянала, напісаным на музычную тэму самадзейнага аўтара. Вядома, творчая індывідуальнасць прафесіянальнага кампазітара, больш моцная і сваёй тэхнічнай падрыхтаванасцю і ідэйна-мастацкім кругаглядам, часта пачынае, шчыра кажучы, «падбіраць пад сябе» індывідуальнасць аматара. І ад яго першапачатковай задумы застаецца толькі голая схема. Калі падобная тэндэнцыя будзе працягвацца і ў далейшым, дык наўрад ці можна будзе гаварыць пра сваё творчае аблічча самадзейных кампазітараў, пра іх самастойны шлях развіцця.

Іншы раз вопытны майстар музыкі бярэцца за апрацоўку яўна слабага твора і пачынае яго даводзіць да адпаведнай «кандыцыі». Каму патрэбна такая работа? Такім жа чынам не толькі ўводзяцца ў зман масавыя слухачы, але і ганьбіцца высакародная ідэя нараджэння сучаснага народнага рэпертуару. Замест таго, каб сапраўды памагчы аўтару-аматару самому дасягнуць у сваёй творчасці станоўчых вынікаў, кампазітар-прафесіянал усё робіць і дапрацоўвае за яго. Пры гэтым міжволі закладваюцца асновы такіх адмоўных з'яў у народным мастацтве, як утрымальніцтва (усё роўна хто-небудзь дацягне!), несамакрытычныя адносіны да сваёй творчасці (урэшце ж дапрацоўваў твор сам прафесіянал!) і, нарэшце, графаманія — жудасная бяда ўвогуле ўсялякага мастацтва. Безумоўна, людзей, якія не маюць сапраўдных музычных дадзеных і здольнасцей, не трэба цягнуць у «кампазітары».

Куды больш сур'ёзныя вынікі могуць быць у тых выпадках, калі «апрацоўваюцца» мелодыі таленавітых самадзейных аўтараў. З-за недастаткова чулага падыходу да іх з боку некаторых прафесіянальных кампазітараў, гаму што гэтыя кампазітары не могуць зразумець своеасаблівасць народнага музычнага стылю, знікае самабытнасць і арыгінальнасць творчасці складальнікаў песень.

Калі параўноўваеш змешчаныя ў розных зборніках песні з іх першапачатковымі неапрацаванымі арыгіналамі, дык часта бачыш два, можна сказаць, самастойныя меладычныя ўзоры. Як, напрыклад, у песні «За мір і шчасце» з гомельскага зборніка «Па-над Сожам галасы». Галоўная ж увага ў падобных публікацыях аддаецца музычнаму суправаджэнню, якое ўвогуле часта належыць цалкам кампазітару-прафесіяналу.

Праўда, у гэтым жа гомельскім зборніку (у ім найбольш поўна праявіўся прынцып «прафесіяналізацыі» творчасці аматараў) сустракаюцца прыклады арганічнага пранікнення прафесіянальнага кампазітара ў задуму самадзейнага аўтара (песні «Выйду ў поле» або «Шчабятуха»). Гэта ў першую чаргу адносіцца да такіх кампазітараў, як нябожчык Р. Пукст і Ю. Семяняка. На прыкладзе актыўнага шэфства гэтых двух кампазітараў над аматарамі наглядна відаць і другая важная асаблівасць падыходу да аматарскай творчасці. Яны апрацоўвалі песні толькі тых, хто быў бліжэйшы да іх мастацкіх поглядаў і больш зразумелы ім, чаго, на жаль, нельга сказаць пра некаторых іншых дзеячоў музыкі.

Хто не ведае, напрыклад, выдатнай рускай песенніцы Аграфены Аленічавай? Але трэба сказаць, што асобныя прафесіянальныя аўтары яе песні таксама занадта радыкальна апрацоўвалі. Вось што з гэтай прычыны неяк сказаў савецкі кампазітар А. Копасаў: «У яе (Аленічавай) творчасці можна было памагаць, можна было перашкаджаць, але ствараць за яе было немагчыма». Гэтыя вельмі правільныя словы цалкам адносяцца і да многіх беларускіх складальнікаў песень. Успомніце, напрыклад, Т. Лапаціну, якая ўмее арыгінальна пераасэнсоўваць традыцыйныя мелодыі, ці А. Шыдлоўскага з яго самабытным кампазітарскім почыркам, блізкім да гарадской народнай песні. Хіба можна што-небудзь дапрацаваць за гэтых таленавітых самародкаў?

Самабытнасць творчасці таго ці іншага аматара трацінь яшчэ і таму, што да песень штучна дадаюць акампанемент, які ўступае ў стылістычную супярэчнасць з мелодыяй. Тыповы прыклад гэтаму знаходзім зноў-такі ў зборніку «Па-над Сожам галасы». У апублікаванай у ім песні «З другам» В. Жураўлёва народная па характару мелодыя не мае нічога агульнага з вытанчаным, рамансавага тыпу, акампанементам.

Дарэчы, хочацца спытаць, чаму кожная песня павінна абавязкова мець акампанемент? Ці заўсёды ён патрэбен? А ў апошні ж час і самі самадзейныя аўтары пачалі пісаць песні і харавыя творы, якія павінны абавязкова выконвацца ў суправаджэнні якога-небудзь інструмента. Прычым, у радзе выпадкаў акампанемент ствараецца не таму, што гэтага патрабуе песня, а таму, што, на думку саміх аматараў, ён надае іх твору вядомую паважнасць і служыць адзнакаю больш высокага майстэрства. У выніку паступова забываецца выдатны акапэльны, або, як часта гавораць у беларускім народзе, «арцельны» стыль харавога спявання, той стыль, якім па праву можа ганарыцца не толькі беларуская, але і руская, і ўкраінская песнятворчасць. Вось дзе сапраўды патрэбна актыўнае ўмяшанне прафесіянальнага кампазітара ў справы музычнай самадзейнасці!

Імкненне абавязкова стварыць якую-небудзь інструментальную падтымку харавым галасам наглядаецца не толькі ў галіне самадзейнай творчасці. Пры азнаямленні з выканаўчай самадзейнасцю часта таксама сустракаешся з гэтым недахопам. Не сакрэт жа, што многія аматарскія хоры, якія ўзніклі ўвогуле на аснове народнага акапэльнага спявання, пачалі чамусьці баяцца выступаць без інструментальнага суправаджэння нават пры выкананні традыцыйных песень. У сувязі з гэтым трацяцца ансамблевасць і чысціня інтаніравання, ды і сама эмацыянальная шчырасць у спяванні.

Апроч таго, што да кожнай песні, да кожнага хору літаральна прывязваецца інструментальнае суправаджэнне, у іх сустракаюцца і іншыя музычныя «празмернасці».

Нярэдка прафесіяналы-кансультанты, праглядаючы творы самадзейных аўтараў, робяць такія заўвагі: «Тут простая гармонія, трэба рабіць адхіленні» або: «Зрабіце разнастайным рытм, дадайце храматычныя праходзячыя». У сувязі з гэтым паміж самадзейнымі і прафесіянальнымі кампазітарамі нярэдка ўзнікаюць рознагалоссі. А прыйсці да адзінай думкі можна толькі тады, калі правільна будзе ўстаноўлены стыль, у якім піша пэўны самадзейны аўтар.

Іншы раз, вядома, можна пагадзіцца з музыкантам-кансультантам, калі ён падыходзіць да твораў самадзейных аўтараў з пункту погляду іх прафесіянальнага майстэрства. Бо, як вядома, развіццё творчасці асобных самадзейных кампазітараў ідзе па лініі актыўнага збліжэння з прафесіянальнай культурай. У гэтым выпадку прэтэнзіі аматарам адносна недастатковага валодання імі гармоніяй, паліфоніяй, музычнай формай, харавой і інструментальнай фактурай зусім справядлівыя.

Але трэба таксама не забываць і пра тое, што гэта ў самадзейнай творчасці не галоўнае. Зусім натуральнае жаданне многіх аматараў набыць прафесіяналізацыю ў музыцы. Гэта заканамерны працэс і гэта павінна заахвочвацца. Але дрэнна, калі гэты самы працэс становіцца самамэтай, калі да ўсёй народнай творчасці падыходзяць з аднолькавай меркай, не ўлічваючы яе разнастайнасці і спецыфікі.

Зусім правільна, што сучаснай народнай творчасці ставяцца некалькі іншыя патрабаванні, чым традыцыйнаму фальклору, але гэта не значыць, што трэба ўвогуле ігнараваць гэты фальклор. Наадварот, толькі развіццё і ўзбагачэнне нацыянальных традыцый можа прывесці да сапраўднага росквіту сённяшняга народнага мастацтва. Іменна на гэта і неабходна звярнуць галоўную ўвагу, не адмаўляючы, зразумела, і шляхоў прафесіяналізацыі.

Імкненне дамагчыся ад кожнага самадзейнага кампазітара таго, што патрабуецца ад прафесіянала, само па сабе некалькі парадаксальнае. Бо калі самадзейны кампазітар становіцца прафесіяналам, ва ўсякім выпадку па ўзроўню майстэрства, ён перастае быць самадзейным. У адваротным выпадку (гэта сустракаецца значна часцей) ён ператвараецца ў дылетанта-недавучку. Відавочна, што розніца паміж прафесіянальным і самадзейным кампазітарам павінна заключацца не столькі ў ступені валодання кампазітарскай тэхнікай, колькі ў своеасаблівасці шляхоў развіцця іх творчага стылю. Іменна такім чынам самадзейная музычная творчасць можа вызваліцца ад многіх сваіх недахопаў і стаць на шлях творчай самастойнасці.

В. ЕЛАТАЎ.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА

ТВОРЫ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ І КЛІЧУЦЬ

Пасля заканчэння сярэдняй школы я прыехаў з Кітая вучыцца ў Маскоўскі універсітэт. Тут я пазнаёміўся з літаратурай народаў СССР, у тым ліку і з беларускай. Для мяне гэта было незвычайнай радасцю. Часам я цэлымі днямі з захапленнем чытаў творы беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча.

Што мне падабаецца ў іх творах? Перш за ўсё, яны выяўляюць рэвалюцыйныя імкненні беларускага народа. Янка Купала і Якуб Колас паказалі маральную і разумовую перавагу простага селяніна над памешчыкамі, буржуазіяй, царскімі чыноўнікамі. Яны стварылі вобраз селяніна, які ўсвядоміў сваё чалавечае права, сваю сілу і сваю непазбежную перамогу. У паэмах «Курган», «Бандароўна» Янкі Купалы і «Сымон-музыка» Якуба Коласа мы бачым сапраўдны характар народа, яго чалавечы гонар і няна-вісць да прыгнятальнікаў. Гэтае пачуццё чалавечай годнасці выклікае ў нашага чытача захапленне.

Янка Купала і Якуб Колас — глыбока нацыянальныя паэты — адлюстроўвалі інтарэсы не толькі свайго народа, але і іншых рэвалюцыйных народаў, у прыватнасці, кітайскага. Мы доўгі час жылі ў такіх жа цяжкіх умовах, як і беларускі народ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Таму кітайскі чытач з вялікай прыемнасцю і асалодаю чытае творы класікаў беларускай літаратуры.

Тут, у Маскве, я пазнаёміўся таксама і з творамі беларускіх пісьменнікаў Кандрата Крапівы, Міхася Лынькова, Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова. Сярод гэтых талентаў не пастарэлі, а памаладзелі класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас.

Паэмы «Над ракой Арэсай», «Тарасова доля» Я. Купалы і «Рыбакова хата» Я. Коласа маюць вялікае гістарычнае значэнне. У паэмах адлюстраваны жыццё беларускага народа, яго барацьба за шчасце. Што вабіць замежнага чытача ў гэтых паэмах? Нас, кітайцаў, перш за ўсё, — іх рэвалюцыйны гуманізм, барацьба за мір і дружбу народаў, сцвярджэнне эстэтыкі працоўных.

З вялікім хваляваннем я чытаў:

Мае браты, мае суседзі,
Свабодны, новы польскі люд.
Няхай жа песняй звонкай медзі
Красуе наша дружба тут.
(«Рыбакова хата»).

Сіла нацыянальнага характару, вялікі інтэрнацыяналізм працоўных Беларусі глыбока мяне ўразілі.

Калі я пазнаёміўся з беларускай літаратурай, мне стала вельмі шкада, што пакуль не магу чытаць яе ў арыгінале. Але я вывучу беларускую мову, буду чытаць беларускую літаратуру ў арыгінале, каб знаёміць з ёй кітайскіх чытачоў, каб наш народ больш і шырэй ведаў пра жыццё і барацьбу братняга беларускага народа.

ВАН ШОУ-ЖЭНЬ,
студэнт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта.

Мой родны кут, як ты мне мілы!..

Хоць раз, ды добра агрызнуўся!

Творчасць народнага песняра Беларусі Якуба Коласа была і застаецца невычэрпным матэрыялам для мастакоў. «Новая зямля», «Сымон-музыка», «Рыбакова хата», трылогія «На ростанях» натхнялі і натхняюць беларускіх мастакоў. Ілюстрацыі да паэмы «Новая зямля» — дыпломная работа былой студэнткі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута В. Ганчаровай. Гэтыя малюнкі знаходзяцца ў фондах Літаратурнага музея Якуба Коласа. Друкуюцца ўпершыню.

...Збірай манаткі і ў Парэчча
За добры час перабірайся!



Каля зямлянкі тут прыветна
Гарэў агеньчык чуць прыкметна...



І як ні кляў ён гэту п'яўку,
Ды мусіў даць рубля за спраўку.

І паглядзець было цікава,
Як дзядзька шчыра і ласкава
Касу на рынку выбірае!

З братняй любоўю

Творы народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа добра вядомы сярод украінскіх чытачоў. У гэтым вялікая заслуга ўкраінскіх пісьменнікаў і літаратараў В. Шчурата, І. Свяцікага і інш. Яны ў свой час падтрымалі добрым словам нашых незабыўных песняроў у іх нялёгкай, але пачэснай працы, якая дала багаты плён на беларускай літаратурнай ніве.

Кнігі ўкраінскага вучонага і літаратара І. Свяцікага («Адраджэнне беларускага пісьменства», 1908 г; «Росквіт культурна-нацыянальнага жыцця Усходняй Беларусі», 1928 г.), прысвечаныя развіццю беларускай культуры і літаратуры, сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Аўтар у сваіх работах знаёміў украінскага чытача і з творчасцю Я. Купалы і Я. Коласа.

Разглядаючы творы беларускіх паэтаў, украінскі вучоны пісаў у 1908 г.: «...Як бы там ні было, але вершы, што выходзілі з сэрца песняроў у тыя цяжкія мінуты, адносяцца да найпрыгажэйшых лірычных твораў беларускай пісьменнасці, бо яны пісаны жывою крывёю паэтаў».

У кнізе «Росквіт культурна-нацыянальнага жыцця Усходняй Беларусі» ёсць асобны раздзел, які называецца «Два сонцы беларускага пісьменства». «Янка Купала і Якуб Колас — вось тыя, што ўжо цэлых 20 гадоў служаць беларускаму народу, асвятляючы яго жыццё-быццё жыватворнымі праменнямі сваёй паэтычнай творчасці», — так пачынае І. Свяцікі гаворку аб іх творчасці. Ён падкрэсліваў, што Купала — гэта паэт, які выйшаў з асяроддзя народа і з самага пачатку сваёй творчасці «быў беларускім Кальцовым і Шаўчэнкам», а яго песні «выклікалі ў адных слёзы на вачах, а ў другіх запальвалі агонь у сэрцы».

Ацэньваючы творчасць Якуба Коласа, І. Свяцікі зазначае, што ў сэнсе паказу дарэвалюцыйнага жыцця Коласа можна прыняць за беларускага Франко, што ён з'яўляецца адным з лепшых выказнікаў «паслярэвалюцыйнага жыцця Беларусі».

У заключэнне аўтар піша: «Для абодвух найбольш вядомых паэтаў Беларусі Купалы і Коласа рэвалюцыя з'яўляецца жаданай, чаканай і неабходнай падзеяй жыцця, якую яны разам услаўлялі на працягу поўных дзесяці год у сваёй дарэвалюцыйнай творчасці».

Працы ўкраінскага вучонага — яшчэ адна яскравая старонка дружбы і творчых узаемасувязей паміж беларускім і ўкраінскім народамі.

М. БАЗАРЭВІЧ.

Сустрэчы ў Чэбаксарах

Маскоўскае выдавецтва «Советский писатель» выдае кнігу «Янка Купала ва ўспамінах сучаснікаў», у якой змешчана звыш пяцідзесяці ўспамінаў рускіх, украінскіх, беларускіх пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў, настаўнікаў. Зборнік падрыхтаваны Літаратурным музеем Я. Купалы. Некаторыя матэрыялы зборніка публікуюцца ўпершыню. Сярод іх — успаміны народнага паэта Чувашскай АССР С. Эльгера, які мы друкуем са скарачэннямі.

С. ЭЛЬГЕР,
народны паэт Чувашскай АССР

Упершыню пазнаёміўся я з Янкам Купалам у верасні 1939 года. Гэта было ў вагоне, калі мы, савецкія пісьменнікі, ехалі ў Ерэван для ўдзелу ў святкаванні тысячагоддзя армянскага народнага эпасу «Давід Сасунскі».

Вялікая група пісьменнікаў ехала ў трох вагонах поезда Масква — Баку, а з Баку праз Тбілісі ў Ерэван. Беларускія пісьменнікі, у тым ліку і Янка Купала, знаходзіліся ў сумежным з намі купэ. Ехалі мы каля трох сутак і за гэты час паспелі не толькі пазнаёміцца, але і прывыкнуць адзін да аднаго. Ужо тут, у вагоне, мне не раз даводзілася сустракацца з Янкам Купалам і гаварыць з ім.

Але бліжэй я пазнаёміўся з ім у час экскурсіі на возера Севан. Я. Купала сядзеў нерухома і глядзеў на горы на процілеглым беразе возера.

— Прыродаю Арменіі захапляецеся, Іван Дамінікавіч?.. Праўда, цікава тут, своеасаблівая прырода: горы, горы, а на гары раптам такое цудоўнае возера! — сказаў я, набліжаючыся да яго.

Купала паглядзеў на мяне і, напаўна, пазнаўшы ў маёй асобе знаёмага па вагону чалавека, адказаў:

— Так... Закаўказзе. Своеасабліва...

Ён прапанаваў мне прысесці.

Сядаючы, я побач з сабою паклаў палку (з ёю я не расстаюся з першай сусветнай вайны, калі стаў інвалідам). У мяне была добрая палка з чырвонага дрэва, з шарападобнай самшытавай булдавешкай. Я. Купала звярнуў на яе ўвагу. Ён уважліва агледзеў яе, пакруціў у руках і, размахваючы ў паветры, сказаў: «Прыгожая... але, здаецца, лёгка паламацца можа».

— Я асцярожна абыходжуся з ёю. Берагу, як зрэнку вока, — адказаў я.

Купала ўсміхнуўся і пацікавіўся, калі і пры якіх акалічнасцях я знявечыў нагу. Потым, даведаўшыся, што я з Чувашыі, перайшоў на іншую гаворку.

Ён з хвіліну памаўчаў, скіраваўшы позірк на сінія пад сонцам гмахі гор, потым зноў павярнуўся да мяне:

— Як многа давялося змагацца армянскаму народу за сваю незалежнасць! Колькі войнаў давялося яму вытрымаць на працягу некалькіх стагоддзяў!.. Тут, у раёне гэтага самага Севана, кіпелі баі з арабскімі і персідскімі прыгнятальнікамі... Сяджу, гляджу вось на схілы гэтых прыбярэжных гор і мроіцца, што вось-вось хлынуць з цяснін, са скал лавіны старажытных воінаў — армяне, арабы, сельджукі з коп'ямі, мечамі, шчытамі і закіпіць жорсткі бой!.. Так і здаецца, нібы чуваць жахлівыя крыкі, удары мечамі, коп'ямі па шчытах і латах, чуваць бразганне зброі і іржанне коней.

Гаварыў ён гэта павольна і ціха, нібы для сябе, але ясныя светла-шэрыя вочы былі скіраваны на мяне. Я слухаў яго моўчкі і ўважліва.

Сядзелі мы яшчэ з паўгадзіны. Іван Дамінікавіч распытваў у мяне пра прыроду нашага краю, пра чувашскіх пісьменнікаў, пра нашу літаратуру і мастацтва.

Я прапанаваў Купалу зрабіць прагулку па Волзе і па дарозе завітаць да нас, у Чабаксары.

— Магчыма, калі-небудзь і ўдасца, — згадзіўся ён.

І, праўда, праз два гады мы сустрэліся з Купалам у Чабаксарах. Гэтая сустрэча адбылася ў дні Вялікай Айчыннай вайны, у самы цяжкі час для ўсяго савецкага народа, і пакінула незабыўны след у маёй памяці.

У час прыезду Купалы я знаходзіўся на занятках у Доме друку. Мне паведамілі, што прыехаў вялікі беларускі пісьменнік Янка Купала і чакае мяне ў двары нашага дома. Я заспяшаўся дадому.

Прыйшоўшы на двор, я ўбачыў тры легкавыя аўтамашыны і людзей ля пад'езда нашага дома.

Сярод незнаёмых я адразу пазнаў Купалу. Ён быў у цёплым паліто, у футравай шапцы. Убачыўшы мяне, Купала з распасцёртымі рукамі кінуўся насустрач.

— Таварыш Ольгер, здароў, здароў, дружа! Падумаць толькі, вось як суджана зноў сустрэцца нам! — сказаў ён усхваляваным голасам, сумна ўсміхаючыся.

Мы абняліся, пацалаваліся. Купала быў узрушаны, на ягоныя вочы набеглі слёзы.

— Прызнацца, я ваша прозвішча быў забыў, таварыш Ольгер*, — пачаў расказваць ён спяшаючыся. — І вось, калі спыніліся на плошчы ў цэнтры горада, пытаюся пра вас у прахожых: ці не ведаеце вы, дзе, жыве паэт, які кульгае на адну нагу і ходзіць, абапіраючыся на палку. Інвалід ён, чалавек немалады, кажу я. Не ведаюць. Вось і стаялі каля паўгадзіны. Нарэшце, знайшоўся адзін мужчына, які і прывёз нас проста сюды.

Калі хваляванне крыху ўляглося, ён ужо больш спакойным тонам расказаў:

— Бачыце, мы эвакуіраваныя... Давялося выехаць з Масквы, пакінуўшы ўсё... Нам загадана прыехаць у Казань і часова спыніцца там. Але мы вельмі стаміліся, да таго ж прастудзіліся ад доўгай асенняй дарогі. Хочацца нам адпачыць дваты дні. На жаль, гасцініцы перапоўнены, нікога не прымаюць. Дык вось, таварыш Ольгер, калі ласка, прытуліце нас у сябе і дайце аддыхацца пасля такіх пакут, — гаварыў ён.

Ад гэтых слоў Купалы ў мяне самога нагарнуліся слёзы.

— Іван Дамінікавіч! Калі ласка, спыняйцеся ў нас не толькі на два-тры дні, а калі спадабаецца, то і на больш доўгі час. Заставайцеся і будзьце, як дома!

— Не, не! Толькі на тры дні, — адказаў Купала. — Мы ў Казань...

Затым ён пазнаёміў нас са сваёй жонкай Уладзіславай Францаўнай і іншымі таварышамі, што прыехалі разам з ім.

Цяжка пакутуючы за лёс сваёй роднай Беларусі, Купала з болем расказваў пра жахі, якія давялося бачыць у Мінску і па дарозе ў Маскву. Нямецка-фашысцкія сцярвятнікі бязлітасна бамбілі гарады і вёскі, расстрэльвалі старых, жанчын і дзяцей, што ішлі па дарогах. Усё гэта зрабіла страшэннае ўражанне на паэта.

Іван Дамінікавіч і яго жонка расказвалі, што ім давялося выехаць з Мінска нечакана і хутка, пакінуўшы ўсё. Яны здолелі захапіць з сабою толькі тры-чатыры чамаданы з бялізнаю і кнігамі, у тым ліку некалькі экземпляраў зборніка «Ад сэрца». Купала гараваў аб сваёй бібліятэцы і асабістым архіве.

...Назаўтра, як толькі развіднела, я пайшоў да іх у пакой.

Купала не спаў. Ён сядзеў на краю ложка, спусціўшы босыя ногі на падлогу.

— Не спіцца, Іван Дамінікавіч?.. Даўно прачнуліся?

— Даўно... Сяджу вось, як пень, — адказвае ён.

— Як жа гэта так?! Вы вельмі стомлены, знясілены... і не спіце... Можа, вам дрэнна паслалі? — пытаюся я шэптам, каб не пабудзіць Уладзіславу Францаўну. Але яна прачнулася і ўмяшалася ў нашу гаворку:

— Нічога нам не перашкаджала... Памяшканне цёплае, пасцель мяккая. Спі ды спі... — адказала Уладзіслава Францаўна.

— Хіба можна цяпер спаць непрабудным сном?! Думкі, думкі спаць не даюць! — усклікнуў Купала.

Пачалася трансляцыя радыёперадач з Масквы. Слухалі паведамленні Савецкага інфармбюро. Слухалі ўважліва, стараючыся не прапусціць ніводнага слова.

У паведамленнях Інфармбюро нічога, што суцешыла б, не было. Часці Чырвонай Арміі пакінулі Смаленск і іншыя населеныя пункты... Купала, сціснуўшы зубы, маўчаў. Ён доўга ні з кім нічога не гаварыў. Толькі зрэдку міргалі яго светла-шэрыя круглыя вочы, скіраваныя ў бок рэпрадуктара.

Удзень мы з Іванам Дамінікавічам пайшлі ў Дом Саветаў і дабіліся там прыёму ў першага сакратара абласнога камітэта партыі тав. Чарыкава. У яго знаходзіўся і старшыня Саўнаркома Чувашскай АССР тав. Сомаў. Яны добра ведалі пра Янку Купалу і цёпла да яго аднеслісь. Я расказаў ім пра цяжкае становішча Купалы з харчаваннем і курывам. Чарыкаў і Сомаў паабяцалі зрабіць усё магчымае. На развітанне Купала падзякаваў ім і падарыў сваю кнігу «Ад сэрца»..

*) Купала першы час ніяк не мог правільна вымаўляць маё прозвішча: замест «Эльгер» гаварыў «Ольгер».

ЧАМУ Ж АДСТАЕ ОПЕРА?

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

мі ж моцна трымалі ў абдымках традыцыі старой оперы. Новы матэрыял таксама падганяўся пад звыклыя ўяўленні. Адхіленне ад усталяваных асаблівасцей жанра, ці, тым больш зліццё асобных рыс розных жанраў у нешта новае, успрыймалася ледзь не як парушэнне праўды мастацтва. Каб не хадзіць далёка па прыклады, успомнім нядаўнія спрэчкі вакол оперы «Калючая ружа». Якіх толькі супярэчлівых думак не выказвалася. І асабліва па самому жанру. Лірыка-камічная опера? Сярэдняе паміж операй і аперэтай? Не, такога быць не можа. І настойліва раілі аўтарам «дацягваць» оперу да аперэты. Л. Александроўская ў сваім артыкуле нават рашыла супрацьставіць два розныя жанры і аб'явіць, нібыта опера «Яснае світанне» з'яўляецца творам «больш дасканалым і цэласным», чым «Калючая ружа». Я не думаю, што мяне можна абвінаваціць у неаб'ектыўнасці ці прыхільнасці да таго ці іншага твора, бо я з'яўляюся аўтарам лібрэта абедзвюх опер. Аднак супрацьстаўляць творы розных жанраў, розных па характары і па матэрыялу, і разглядаць іх без уліку аўтарскай задумы і жанравых асаблівасцей, па меншай меры, справа несур'ёзная. Невыпадкова Л. Александроўская ў сваім артыкуле не называе пастаноўшчыкаў спектакляў, бо калі назваць іх імёны, кожнаму стане ясна, што яна абараняе толькі той твор, які сама, як рэжысёр, ставіла на сцэне.

Кажуць, што пра густы не спрачаюцца. Гэта так. Аднак пры ацэнцы твора прыхільнасць крытыка да таго ці іншага жанра ці стылю мае немалаважнае значэнне. Ад гэтага ў многім залежыць правільнасць ацэнкі. Л. Александроўская, як я заўважыў, не з'яўляецца прыхільніцай камічных твораў і гэтая акалічнасць дае сябе адчуваць. Я памятаю, як яшчэ пры першым абмеркаванні лібрэта «Калючай ружы» яна выступала супраць гэтага жанра, патрабуючы карэннай перапрацоўкі твора. Ёй хацелася, каб я пісаў не лірыка-камічны твор, а «сур'ёзную» оперу, з гераіняй, падобнай да Кармэн. Я не пагадзіўся тады з гэтай думкай і дапрацаваў твор так, як ён быў задуманы і як гэтага вымагаў жыццёвы матэрыял.

Дарэчы, і пазней асобныя крытыкі папракалі мяне і кампазітара Ю. Семяняку, аўтара музыкі «Калючай ружы», за тое, што мы не стварылі ў сваёй оперы гераічных вобразаў нашай моладзі, вартых пераймання. Вось тут, як кажуць, у гародзе бузіна, а ў Кіеве дзядзька. Мы пісалі лірычную камедыю, а крытыкі пры разглядзе твора падыходзяць да яго з законамі іншага жанра.

У сваім артыкуле Л. Александроўская, пярэчачы тым таварышам, якія пры ацэнцы твора раяць улічваць і думку публікі, наведванне ёю спектакляў, піша: «У пытаннях выхавання мастацкага густу, маральных якасцей новага чалавека — будаўніка камунізма мы павінны кіравацца высокай патрабавальнасцю, весці гледача за сабой, а не ісці па лініі найменшага супраціўлення».

У прынцыпе пярэчыць такому сцвярджэнню нельга. Яно правільнае. Але ж катэгарычна прыняць яго і адарвацца ад інтарэсаў слухача таксама нельга. Бо тут жа зноў узнікае не менш важнае і заканамернае пытанне: а якім жа чынам мы павядзём слухача за сабою, калі ён слаба наведвае сучасныя спектаклі, калі яму на нашых спектаклях «часта бывае сумна», калі «ён не хвалюецца» і «не заўсёды яго кранаюць вобразы оперных герояў»? Пры такім становішчы заклік весці гледача за сабой — прыгожая ілюзія, марная надзея. На нашу долю застанецца задача выхавання не густу гледачоў, а густу... пустых крэслаў.

Выхоўваць гледача — гэта значыць уздзейнічаць на яго сілай пачуццяў. А гэта могуць зрабіць толькі тыя творы, якія хвалююць гледача. І па тым, колькі людзей у зале, мы можам меркаваць аб масавасці гэтага ўздзеяння. Хоць лічбы ў мастацтве — не галоўны аргумент, але і іх мы не маем права ігнараваць, бо пры сур'ёзным аналізе лічбы могуць на многае адкрыць нам вочы, у прыватнасці, на тое, што асобныя нашы творы страляюць міма цэлі, не дасягаючы і сотай долі таго, на што мы спадзяваліся. Гэта ж не сакрэт, што са словамі «сучасная опера» ў слухача асацыіруецца паняцце — нецікавая опера. Мы павінны разбурыць гэтае ўяўленне, але не на словах, а на справе. Савецкая опера павінна быць і цікавай, і хвалюючай, і яркай па рэжысёрскаму ўвасабленню. На оперных спектаклях слухач павінен не толькі слухаць выдатныя галасы спевакоў, але і знаходзіць адказы на шматлікія хвалюючыя пытанні жыцця. Опера мае вельмі вялікія магчымасці ў гэтым плане. Пакуль што яны амаль не выкарыстоўваюцца. У лепшым выпадку мы ілюструем жыццё, а не раскрываем яго вострыя праблемы, а ілюстрацыя, як вядома, не дае магчымасці стварыць цікавыя характары.

Патрабуе перагляду і рэжысёрская практыка. Старымі прыёмамі новай тэмы не вырашыш. Складанасць рэжысёрскага ўвасаблення «Калючай ружы» ў тым і заключалася, што для яе пастаноўкі былі непрыдатны ранейшыя оперныя сродкі. Рэжысуры шмат давялося папрацаваць, каб знайсці адпаведнае тэме новае мастацкае вырашэнне. І героі адразу ажылі, нават хор перастаў быць статычнай масай. Мы бачым людзей у дзеянні, а не оперны хор, як, напрыклад, у «Ясным світанні». Каму, як не рэжысёрам і крытыкам-музыказнаўцам, у першую чаргу патрэбна было на ўвесь голас загаварыць пра гэта, не баючыся закрануць самалюбства таго ці іншага творчага работніка?

У заключэнне хочацца зрабіць яшчэ адну заўвагу пра артыкул Л. Александроўскай. Я маю на ўвазе тое месца яго, дзе аўтар абвінавачвае дырэкцыю тэатра і пастаноўшчыкаў у тым, што яны «ўключаюць у рэпертуарны план творы, якія не маюць нават сваёй назвы, калі лібрэтыстам яшчэ не напісана ніводнага радка, а кампазітарам — ніводнае ноты. А потым час падганяе, трэба выконваць абяцанні, і ў выніку на сцэне з'яўляецца няспелы твор. Так яно было з «Калючай ружай»...

Так з «Калючай ружай» не было. «Калючая ружа» была ўключана ў рэпертуарны план толькі пасля таго, як былі абмеркаваны на пашыраным пасяджэнні мастацкага савета тэатра сумесна з актывам кампазітараў не толькі лібрэта, а і музыка оперы. Прычым абмеркаванне вялося пасля праслухоўвання опернага клавіра ў жывым выкананні салістамі партый. Дарэчы, на гэтым жа абмеркаванні прысутнічала і сама Л. Александроўская.

Неабгрунтаваныя папрокі ёсць і ў іншых месцах артыкула. Чытаючы іх і ўспамінаючы выступленне Л. Александроўскай на з'ездзе кампазітараў, адчуваеш па падтэксце, што яна імкнецца стварыць уражанне нібыта, калі яна працавала ў тэатры, справы там ішлі лепш, а вось пакінула тэатр — і ўсё пайшло на заняпад. Было б куды лепш, калі б Л. Александроўская выкарыстала свой вопыт не на такія справы. Яе веды і багатыя наглядданні для нас куды даражэйшыя і цікавейшыя, чым асабістая крыўда на некаторых работнікаў тэатра. Творчыя справы павінны быць вышэй за асабістыя інтарэсы.

Да музычнай крытыкі беларускія пісьменнікі маюць нямала прэтэнзій. І галоўная з іх — прэтэнзія на безуважнасць да разгляду таго станоўчага, што зроблена паэтамі рэспублікі ў галіне оперных і балетных лібрэта. Ніводнай сур'ёзнай працы. Пра лібрэтыстаў крытыка ўспамінае толькі тады, калі шукае прычын няўдач опернага ці балетнага спектакля. Хацелася б, каб і тут становішча змянілася ў лепшы бок. Сур'ёзным і грунтоўным аналізам твораў крытыка павінна заслужыць сваё права быць разумным дарадчыкам і сапраўдным прыхільнікам оперы.



П. СЕРГІЕВІЧ. Партызаны ля кузні.

МАСТАК-ГРАМАДЗЯНІН

У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрылася персанальная выстаўка твораў аднаго са старэйшых беларускіх мастакоў П. Сергіевіча, які жыве і працуе ў Вільнюсе. На выстаўцы экспануюцца вялікія мастацкія палотны, пейзажныя творы, партрэты, нацюрморты.

Многія карціны П. Сергіевіча адлюстроўваюць жыццё і гістарычнае мінулае беларускага і літоўскага народаў. Лепшыя з іх — «Першадрукар Ф. Скарына», «К. Каліноўскі і В. Урублеўскі аглядаюць паўстанцаў», «К. Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 г.», «Дэманстрацыя беспрацоўных», «Партызаны ля кузні», «Набат», «А хто там ідзе?» (па матывах купалаўскага верша). Гэтыя творы характарызуюць П. Сергіевіча, як мастака-грамадзяніна, сына беларускага народа.

У раздзеле партрэтнага жанра на выстаўцы экспануюцца партрэты рабочых, сялян, работнікаў культуры і мастацтва. Сярод іх: партрэт паэта М. Танка, беларускага пейзажыста М. Дучыца, Героя Сацыялістычнай Працы А. Качарагіна. Некаторыя партрэтныя малюнкі зроблены алоўкам.

Вялікае месца займаюць на выстаўцы пейзажныя творы, як, напрыклад, «Сабраныя камяні», «Веснавая казка», «Вецер на Нарачы». Карціны і пейзажы мастака вызначаюцца рэалістычным зместам, тэма раскрываецца ў іх глыбока і ўдумліва.

Персанальная выстаўка П. Сергіевіча ў Мінску, якая паказвае вялікі творчы шлях, пройдзены беларускім жывапісцам за многія гады, прыцягвае ўвагу шырокіх мас аматараў мастацтва.

Я. КРАСОЎСКІ. П. СЕРГІЕВІЧ. Адважны шлях.

ВАРТА ПАДТРЫМАЦЬ

Я з цікавасцю прачытаў карэспандэнцыю А. Гарэліка «Кожнай вобласці—перасоўны тэатр», у якой узнімаліся пытанні абслугоўвання сельскага гледача. Мне адразу прыгадалася, як яшчэ да вайны ў старажытным Полацку з аматараў тэатральнага мастацтва быў створаны першы ў рэспубліцы перыферыйны ТРАМ — Тэатр рабочай моладзі, рэарганізаваны потым у Віцебскі абласны перасоўны калгасна-саўгасны тэатр, са сталай базай у Оршы.

Я тады працаваў спачатку ў ТРАМ'е, а пасля некаторы час і ў перасоўным калгасна-саўгасным тэатры (іх да Вялікай Айчыннай вайны ў рэспубліцы было некалькі). Наш калгасна-саўгасны тэатр увесь час вандраваў па Аршаншчыне, Полаччыне, Ветрыншчыне, Расоншчыне, Лепельшчыне і па іншых раёнах Віцебскай вобласці.

Кожны наш спектакль быў сапраўднай крыніцай радасці для тых, хто самааддана працаваў у вёсцы, кожны прыезд калгасна-саўгаснага тэатра ператвараўся ў своеасаблівае свята хлебаробаў, у жаданы культурны адпачынак людзей, якія заўсёды горача і шчыра дзякавалі артыстам тэатра за спектаклі і канцэрты. І так у кожным раёне, у кожным саўгасе і калгасе.

Так было калісьці... А цяпер адзіны пакуль што ў рэспубліцы Бабруйскі перасоўны тэатр пры ўсім жаданні не можа задаволіць усё большы попыт сельскіх гледачоў на тэатральныя пастаноўкі. А рэспубліканскія і абласныя драматычныя трупы калі часам і наведваюць перыферыю, дык выступаюць пераважна на сцэнах раённых дамоў культуры і рабочых клубаў.

Вось, напрыклад, спачатку гэтага года ў горадзе Дуброўна ўжо неадназарова быў са сваімі спектаклямі драматычны Тэатр імя Якуба Коласа. Дзякуй яму за гэта, не забывае. Але ж ён выступае толькі ў раённым цэнтры. А на Дубровеншчыне ёсць нядрэнныя клубы ў саўгасах «Першае мая», «Арловічы», «Зарубы», у калгасах імя Хрушчова, «Беларусь», імя Кірава, «40 год Кастрычніка», «На варце», дзе таксама чакаюць прафесіянальных артыстаў.

Вось тут і павінны былі б адыграць ролю праваднікі сацыялістычнай культуры і сцэнічнага мастацтва перасоўныя калгасна-саўгасныя тэатры, бо яны лепш прыстасаваны да гастрольных паездак у вёску. Адначасова артысты такіх тэатраў практычна памагалі б на месцах у рабоце гурткам мастацкай самадзейнасці калгасаў і саўгасаў.

А. МАЦЫЛЕВІЧ.

г. Дуброўна.

Падзеі. Факты. Навіны

□ Акруговы Дом афіцэраў арганізаваў фестываль кінафільмаў на тэму «За камуністычную мараль савецкага чалавека». У гэтым месяцы воінам Мінскага гарнізона — салдатам, сержантам, афіцэрам і членам іх сем'яў будуць паказаны карціны «Ім было дзевятнаццаць», «Чыстае неба», «Аповесць аб маладжонах», «Балада пра салдата» і інш. Усяго на працягу месяца будзе паказана 12 лепшых кінафільмаў.

□ «Пісьменнікі Рудзеншчыны» — вітрына пад такой назвай абсталявана ў чытальнай зале Рудзенскай бібліятэкі Пухавіцкага раёна. Яна расказвае пра жыццё і творчую дзейнасць паэтаў і пісьменнікаў, якія нарадзіліся на Рудзеншчыне.

Прыгожа афармлены стэнд змяшчае фотаздымкі, расказвае аб літаратурнай дзейнасці Міхаіса Чарота, Макара Паслядовіча, Алеся Бачылы, Хвядоса Шынклера, Уладзіміра Хадыкі, Пятра Рунца.

М. ПІСКУНОЎ.

ПЕРШЫ КРОК

Вернер ЭГЕРАТ

АПАВЯДАННЕ

У пакоі было цемнавата. Святло закрытай настольнай лямпы падала толькі на частку пісьмовага стала і вузкі твар мужчыны, які чытаў старадаўнюю кнігу ў тоўстай вокладцы са свіной скуры. Мякка акрэсленыя губы яго ціха варушыліся пад густымі, пасівелымі вусамі, калі ён ледзь разбіраў дробны шрыфт: «З тых часоў, калі ўзыходзіць сонца, крывавым святлом гарыць каменная вяршыня гары. Таму людзі называюць яе Чырвонай гарой. Яны стараюцца не глядзець адзін аднаму ў вочы, калі заходзіць пра яе гутарка. Не пускаюць яны туды і дзяцей сваіх, баючыся, што з імі здарыцца няшчасце ў гэтым праклятым месцы, дзе загінула столькі людзей».

Дык вось адкуль атрымала сваю назву Чырвоная гара — «Родэнберг». Калісьці графы фон Мансфельды зрабілі гэтую пляскатую вяршыню месцам крывавай расправы. З усёй ваколіцы сюды былі сагнаны людзі. І калі пругонныя з іх жонкамі і дзецьмі, жахаючыся, стаялі перад эшафотам, іншаземныя наёмнікі з гіканнем прагналі скрозь натоўп групу скаваных сялян і рудакопаў—удзельнікаў паўстання.

Асенняе сонца на захадзе ў апошні раз асвяціла ўсіх залацістым святлом. Тады важак паўстанцаў — каржакаваты, падобны да мядзведзя прыгонны, прымушаны катам, схіліў сваю шыю і на яе ў той жа момант са свістам апусціўся цяжкі меч...

Кроў пакараных утварыла вялізныя лужыны. Мноства чырвоных ручайкоў сцякала адсюль у даліну...

Доктар Рынглер, чытаючы, жыва ўяўляў, як рудакопы, сціскаючы ў бяссільным гневе кулакі скаваных рук, павольна ўзнімаліся на дзве груба збітыя прыступкі, дзе іх чакаў кат. Бачыў іх суровыя твары, вочы, у якіх палала нянавісць. Чуў гучны пагардлівы смех, якім адказаў малады бялявы рудакоп на прапанову графа купіць сабе жыццё цаною адрачэння. Чуў, як глуха застагнаў натоўп, калі скацілася з плеч гэтая бялявая галава...

— Колькі часу мінула з тае пары, — прашаптаў Рынглер, — а варварства застаецца. Хіба што метады іншыя...

Можна звязаць чалавека і без дапамогі грубай вяроўкі. Хіба не давялося яму хаваць карціну, якую ён так любіў — «Скаваныя сяляне часоў Вялікай сялянскай вайны»?.. Гэтае палатно падаравала яму цудоўная мастачка Кетэ Кольвіц. Як найвялікшы скарб захоўваў карціну Рынглер, пакуль да яго не прыйшоў на кансультацыю кіраўнік акруговай нацысцкай арганізацыі. Мужчына ў карычневым адзенні СА ступіў да сцяны, здзіўлена паглядзеў на карціну і ўтаропіўся ў доктара злымі вачыма. Гэты оберштурмфюрар працадзіў праз зубы сёетое пра «непрыемнасці» і пра «адсутнасць нямецкага духу», зазначыўшы, што зойдзе праз пару дзён.

Як жа пасля мучыла Рынглера сумленне, калі, правёўшы пасля размовы з оберштурмфюрарам бяссонную ноч, ён пакорліва зняў са сцяны карціну.

Зараз карціна стаяла перад яго вачыма так выразна, быццам асветленая яркім святлом, ізноў вісела на сваім месцы. Глухой, пагрозлівай у пошуках выхаду была сіла, заключаная ў гэтых скаваных адзін з адным палонных сялянах і сялянках! Але чаму ж у гэтым натоўпе скаваных выдатная мастачка намалявала і сябе з такім стомленым, пакорлівым паглядам? Ці не хацела Кетэ Кольвіц сказаць тым самым, што яна абавязана была падзяліць іх лёс і шкадуе аб тым, што ёй не ўдалося гэта зрабіць?..

У суседнім пакоі серабрыста прабіў старадаўні гадзіннік.

— Адзінаццаць гадзін, — падлічыў доктар Рынглер.

Значыцца, паветраная трывога цягнулася ўжо дзве гадзіны. Дзе яны скінуць сёння свой смертаносны груз? Пра гэта таксама нельга было думаць без чырвані сорому. Жанчыны, старыя, дзеці сядзяць цяпер, калоцячыся, у цёмных падвалах і кожны момант чакаюць смерці. Ці варта было пасля гэтага вывучаць медыцыну, змагацца за тое, каб не паміралі дзеці, не спаць начамі ля пасцелі хворага, вырываючы яго з рук смерці?!

— Божа мой! Ці ёсць які-небудзь сэнс у гэтым жыцці?

Погляд Рынглера спыніўся на цьмянай бронзе пасмяротнай маскі Бетховена. «Так, выцерпеўшы столькі пакут, Бетховен усё ж не страціў веры ў людзей і напісаў сваю Дзевятую сімфонію — цудоўную песню радасці чалавецтва. Ён здолеў гэта зрабіць, бо цвёрда верыў — настане дзень, калі ўсе людзі стануць братамі. Але што сказаў бы вялікі Бетховен, каб жыў сёння? Хіба не парваў бы ён сваю Дзевятую?..»

На вуліцы глуха завыла сірэна. Рынглер ускочыў з-за стала, сутаргава схапіўся за спінку крэсла. Пасля, збянтэжаны, зноў сеў за стол — працяглы гук азначаў канец паветранай трывогі.

За акном стаяў халодны лістападаўскі туман. Рынглеру кінуўся ў вочы загаловак газеты, якая ляжала на стале: «На вайне ўжыта новая зброя! Новы агнямёт імгненна ператварае цэлыя кварталы ў мора агню! Супраціўленне немагчыма!»

Сцяўшы зубы, Рынглер з агідай адкінуў газету.

Адчыніліся дзверы, парог пераступіла яго жонка, але засталася стаяць у паўзмроку. Калісьці яна была вельмі прыгожая...

— На сёння, бадай, усё скончылася, Гайнц. Табе трэба адпачыць — заўтра зноў цяжкі дзень. — Не дачакаўшыся адказу, яна дадала: — Нельга ведаць, што будзе заўтра.

— Ты маеш рацыю, Рэната. Нельга ведаць, што будзе заўтра. Такое цяпер наша жыццё!—Рынглер паволі ўстаў, прайшоўся па пакоі. — Гэта ўсё адно, быццам блукаеш у дрымучым лесе і не бачыш не толькі выйсця, але нават пробліску святла...

— Табе ў час паветранай трывогі трэба спускацца ў бомбасховішча. — Рэната панізіла голас, нібы баялася, што іх падслухоўваюць. — Сёння наш інструктар неяк асабліва спытаў, дзе ты дзяжурыш.

Рынглер пагардліва махнуў рукою.

— Вось да чаго мы дайшлі... Намі можа пагарджаць кожны дворнік!

Раптам Рынглер падыйшоў да жонкі і ўзяў яе за руку.

— Не ведаю, што мне рабіць, Рэната! — ён кіўнуў у бок стала, дзе ляжала старадаўняя кніга ў вокладцы са свіной скуры. — Нават калі я, каб забыцца, чытаю старыя кнігі, мяне апаноўвае роспач.

Жонка моцна сціснула яго руку.

— Гэта павінна змяніцца, Гайнц. Не будзем траціць надзеі. Можа, вернуцца нашы сыны з фронту. Ты павінен думаць пра іх.

— На што толькі мы не спадзяваліся, Рэната. Спадзявацца зноў — гэта вар'яцтва! Што цяпер засталося ад чалавечых правоў, гуманізму, ад брацтва народаў і... як там яшчэ называюцца гэтыя рэчы? — Рэзка вырваўшы ў яе сваю руку, ён ступіў да стала і стукнуў далонню па газеце. — Чытай! Вось гэта толькі і засталося — яны паляць жывое цела!..

Рынглер апусціўся ў крэсла і сціснуў тонкімі рукамі галаву. Ён не чуў, як жонка выйшла і следам за ёю ціха пстрыкнуў замок.

Доўга сядзеў ён так. Сярэбраны бой гадзінніка ў суседнім пакоі прагучаў раз, потым яшчэ раз, быццам папярэджваў, што хутка надыдзе поўнач.

Раптам Рынглер уздрыгнуў — у пярэднім пакоі коратка, нерашуча празвінеў званок. Доктар разгублена зірнуў на гадзіннік і, устаўшы, нервова адсунуў крэсла. Каму ён спатрэбіўся сярод ночы? Прыватнай практыкай з тае пары, як яго прымацавалі да шпіталя, ён фактычна не займаўся...

Жонка ўжо спала, служанкі не было дома. Асцярожна зачыніўшы акно, доктар выйшаў у пярэдні пакой, дзе гарэла толькі маленькая сіняя лямпачка. Прыслухаўся. Навокал была цішыня. Ці не памыліўся ён? Можа гэта пазванілі суседзям? Але нейкі дзіўны неспакой прымусіў доктара асцярожна адчыніць дзверы. У густым змроку асенняй ночы нікога не было. Рынглер хацеў быў ужо зачыніць дзверы, як раптам у цемры вырас нейчы цень. Нехта асцярожна пераступіў парог і адразу ж прычыніў за сабою дзверы, не даючы зашчоўкнуцца англійскаму замку. Гэта была жанчына, высокая, у простым цёмным паліто, клятчатая хустка захінала яе лоб і шчокі.

— Што вам трэба ад мяне сярод ночы? — няцвёрда спытаў Рынглер, прадчуваючы, што на яго насоўваецца нейкая бяда.

Жанчына акінула позіркам паўцёмны пакой.

— Вы павінны памагчы, доктар — нам патрэбна дапамога... Вы адзін?

Яна гаварыла шэптам, быццам за ёй гналіся. Цяпер, пры слабым святле сіняй лямпачкі, доктар Рынглер пазнаў яе, і нібы чыясьці халодная рука сціснула яму сэрца. Перш чым ён пачуў першае слова, яму стала да болю ясна, што давядзецца прыняць якоесьці важнае рашэнне, і ўжо нельга ўхіліцца ад гэтага. Не, не дарэмна прыйшла да яго гэтая жанчына— жонка зняволенага камуніста.

— Гэта... гэта няшчасны выпадак, доктар, — прашаптала яна.— Разумееце? Няшчасны выпадак... Трэба памагчы як мага хутчэй, інакш ён страціць многа крыві...

Першым парыванне Рынглера было — уцякаць прэч ад цёмнага бяздоння, якое раптам перад ім адкрылася. Ён зусім не хоча ўблытвацца ў гэтую гісторыю! Думкі яго ліхаманкава мітусіліся, вочы стараліся не сустракацца з умольным позіркам жанчыны.

— Вы звяртаецеся не туды, куды трэба... Так, так! Ідзіце ў шпіталь... гэта ўсяго некалькі крокаў адсюль... Там ёсць ўсё неабходнае для першай дапамогі... там ёсць карэта, я ж—тэрапеўт, не хірург...

Ён гаварыў спяшаючыся, не даючы сабе часу падумаць пра штонебудзь іншае. Так, вядома, гэта выйсце... Ён нічым не можа памагчы ў дадзеным выпадку.

[Заканчэнне на 4-й стар.].

У сувязі з падрыхтоўкай да Дэкады самадзейнага мастацтва у рэспубліцы ствараюцца новыя музычныя, харавыя і танцавальныя калектывы.

Так у Брэсце арганізаваны маладзёжны ансамбль танца. У ім удзельнічае 65 чалавек — рабочыя, служачыя, студэнты, навучэнцы горада.

На гэтым здымку вы бачыце ўдзельнікаў маладзёжнага ансамбля танца, якія выконваюць беларускую польку.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

— Заставайцеся ў Чабаксарах, Іван Дамінікавіч. Жыллплошчы ў мяне хопіць, — звярнуўся я.

— Не, — адказаў ён. — Трэба ехаць у Казань. Там часовае месцазнаходжанне ўрада Беларусі і сакратароў ЦК КПБ. Трэба быць бліжэй да іх, адрывацца ад сваіх не трэба.

Не раз Купала сустракаўся і гутарыў з народным паэтам Чувашыі Н. Паларусавым-Шэлебі і з паэтам Шумковым-Шаўлы, якія жылі ў суседніх са мною кватэрах, з паэтамі Н. Васянкам, Эсхелем і іншымі літаратарамі.

Сядзім, гутарым з Купалам аб чым-небудзь. І раптам ён уздыхне і пачынае гараваць па сваёй радзіме:

— Эх, Беларусь! Беларусь!.. Радзіма мая!.. Гарыш ты і пакутуеш пад прыгнётам карычневай чумы!.. Полчышчы фашысцкіх галаварэзаў топчуць коваными ботам твае палі і лясы, танкі і машыны дратуюць твае аблічча, снарады і бомбы разбураюць гарады, спальваюць твае безабаронныя вёскі, забіваюць невінаватых людзей — братоў маіх... Фанабэрысты, люты вораг! Ён раздзірае жывое цела беларускага народа!

Гаварыў ён гэтыя словы, нібы разважаючы сам з сабою, а калі разважаў, яго позірк накіроўваўся ў невядомую далячынь.

Іншы раз яго настрой яшчэ больш азмрочваўся. Асабліва пасля паведамленняў Інфармбюро, калі перадаваліся несуцяшальныя весткі.

Надышоў дзень ад'езду нашых гасцей з Чабаксар. Гэта было 30 кастрычніка. Як толькі пачало світаць, нашы госці цёпла развіталіся і паехалі.

— Наша наступная сустрэча павінна адбыцца ў Беларусі, таварыш Эльгер... Да пабачэння, да хуткай сустрэчы ў Мінску!— усклікнуў Іван Дамінікавіч, махаючы рукой, калі кранулася машына.

Калі ад'язджаюць блізкія і знаёмыя, заўсёды адчуваеш у доме пустату, а ў душы — нейкі смутак і сум. Такое ж адчуванне ахапіла мяне пасля провадаў беларускіх гасцей. У той дзень я на работу не пайшоў.

Вечарэла. Раптам адрывісты званок. Жонка адчыніла дзверы, і ў пакой нечакана-нягадана ўвайшла ўсхваляваная Уладзіслава Францаўна.

— Няшчасце!.. Наша машына загрузла і ніяк не можам выцягнуць, — паведаміла яна.

З яе расказа мы даведаліся, што яны ад'ехалі ад горада ўсяго шэсць-сем кіламетраў.

Я неадкладна паведаміў аб гэтым тав. Сомаву. Паслалі трактар. Але здарылася другая бяда. Выцягваючы машыну з ямы, зламалі ў яе вось, і прыйшлося паставіць машыну на рамонт у МТС.

Іван Дамінікавіч позна ўвечары зноў вярнуўся да нас. Выгляд у яго быў стомлены, змучаны. Я не адважыўся ў той момант надакучаць яму з пытаннямі.

Пасля гэтага Луцэвічы жылі ў нас яшчэ два дні.

Іван Дамінікавіч заўважыў, што мы харчуемся дрэнна, і гэта яго непакоіла. Ён не раз запрашаў нас паабедаць з імі, стараўся падзяліцца сваім лайкам. Дзяцей нашых — дванаццацігадовую дачку і шаснаццацігадовага сына — ён сам прыводзіў да стала і даваў ім то цукар, то цукеркі то кавалак сыру.

Каб не турбаваць нас, Купала перайшоў у Дом селяніна. Пакой яго быў невялікі, з тэлефонам, радыё. З двух вокнаў адкрываўся краявід шырокай Волгі, якая ў гэтыя дні толькі што пакрылася ільдом. А за ракою відаць быў аж да самага небасхілу цёмна-зялёны бор.

Тут жыў ён яшчэ з тыдзень. Мы сустракаліся з Луцэвічамі штодзённа: то яны прыходзілі да нас, то мы наведвалі іх. Купала адчуваў сябе цудоўна. У яго быў прыкметны прыліў сіл і бадзёрасці. Іншы раз ён нават жартаваў. У яснае надвор'е мы хадзілі па высокім беразе Волгі, спыняліся на старым бульвары, зарослым высокімі ліпамі. Купала цікавіўся гістарычным мінулым чувашскага народа, паўстаннямі супраць казанскіх ханаў і супраць рускага царызму. Цікавіўся ўзнікненнем пісьменнасці, развіццём літаратуры і сучасным узроўнем культуры нашага народа. Я ахвотна расказваў пра ўсё.

Стоячы на беразе шырокай ракі, Купала любаваўся яе веліччу, ільдзінамі, што павольна плылі.

— Так, вялікая гэтая рака! Колькі ў ёй магутнасці і энергіі! Вялікая, як наша савецкая Радзіма. Вораг не здолее перамагчы нас. Ён патоне і захлынецца, як у магутнай рацэ, — гаварыў ён.

Купала кожны дзень даведваўся аб рамонце сваёй машыны. У майстэрні МТС рабочых засталося мала, большасць была мабілізавана ў армію. Але ўсё ж рамонт купалаўскай машыны там лічылі тэрміновай і першачарговай справай.

Нарэшце, 10 лістапада з майстэрні МТС паведамілі, што машына адрамантавана.

Раніцаю 11 лістапада Луцэвічы прыйшлі да нас развітацца. Яны абяцалі запрасіць нас да сябе, як толькі будзе вызвалена Беларусь і ўсталюецца мір.

У гэты ж дзень каля паўдня яны пакінулі горад Чабаксары і ўвечары былі ў Казані. Купала напісаў мне адтуль пісьмо.

Заўчасная смерць Купалы вельмі ўзрушыла мяне. О, дружа мой! Вялікі сын Беларусі і пясняр усёй савецкай зямлі! Як шкада, што не мог ты дажыць да радасных дзён вызвалення сваёй Радзімы. Як бы мы ўзрадаваліся ўсе разам перамозе Савецкай Арміі! Трэба было жыць табе, яшчэ доўга жыць і тварыць!

РАДАСНА БАЧЫЦЬ

Цудоўны месяц май, месяц незабыўнай «вясны народаў» 1945 года, адкрыў семнаццаць год назад новую старонку ў адносінах паміж народамі СССР і Чэхаславакіі. Навекі з'яднала нас у братняй дружбе агульная барацьба за высокія ідэалы чалавецтва — свабоду і шчасце людзей, светлую будучыню камунізма. І мы з гонарам гаворым сёння аб тым, што кожны новы год пасля памятнага мая 1945 года — гэта новы ўздым у стваральнай працы абедзвюх краін, новы крок у збліжэнні нашых народаў, нашых культур.

Магутным вяшчальнікам дружбы з'яўляецца літаратура. І прыемна адзначыць, што ў апошнія гады асабліва плённа развіваецца абмен мастацкімі каштоўнасцямі паміж нашымі краінамі, расце папулярнасць чэхаславацкай літаратуры ў нас, на Беларусі, а савецкай літаратуры — у Чэхаславакіі. Значна павялічылася колькасць перакладзеных на чэшскую і славацкую мовы твораў беларускай літаратуры. На старонках часопісаў і газет Чэхаславакіі з'явіліся новыя даследаванні і артыкулы, якія сведчаць аб шчырай зацікаўленасці нашых сяброў у Празе і Браціславе ростам беларускай культуры.

Літаратурная прэса нашай рэспублікі ўжо адзначала выхад у Празе на чэшскай мове такіх буйных твораў нашай літаратуры, як трылогія «На ростанях» і паэма «Рыбакова хата» Я. Коласа. Цяпер чытач Чэхаславакіі атрымаў у перакладзе на чэшскую мову зборнік вершаў П. Панчанкі «Кніга вандраванняў. І любові» і ў перакладзе на славацкую мову раман І. Шамякіна «Крыніцы».

У кнігу паэзіі П. Панчанкі, любоўна і з добрым мастацкім густам аформленую выдавецтвам «Свет Саветаў», уключаны вершы, якія даюць уяўленне пра творчы шлях паэта, аб асаблівасцях яго майстэрства, аб дыяпазоне яго тэматыкі.

Грамадскасць Чэхаславакіі не ўпершыню знаёміцца з творчасцю П. Панчанкі — яго паэзія была прадстаўлена ў анталогіі «Паэты Беларусі» (1955 г.), асобныя вершы друкаваліся на старонках часопісаў «Прага—Масква», «Чцені о Совецкім Свазу» і інш. На пытанне, чым прыцягвае творчасць нашага паэта літаратараў Чэхаславакіі, лепш за ўсё адказаць словамі перакладчыцы Ганы Врбовай:

«Паэзія Панчанкі ясная, даступная, але гэта не простая паэзія, не паэзія гучных слоў. Можа, іменна таму мы верым у шчырасць яго пачуццяў, можа, іменна гэтым ён набліжае да нас вялікую эпоху, дух якой імкнецца перадаць».

У пасляслоўі да зборніка Г. Врбова з сяброўскай добразычлівасцю аналізуе творчасць П. Панчанкі, адзначае высокае майстэрства паэта ў перадачы дэталей — не толькі знешніх і апісальных, але і больш складаных — унутраных, псіхалагічных, у выкарыстанні фальклорных элементаў, што родніць паэта з Я. Купалам і Я. Коласам. Што ж датычыць блізкасці П. Панчанкі да паэзіі Ул. Маякоўскага, дык Г. Врбова лічыць неабходным падкрэсліць, што «тут няма таго знешняга падабенства, якім вызначаюцца эпігоны Маякоўскага. Панчанку ніяк нельга назваць эпігонам. Для яго Маякоўскі — перш за ўсё ўзор падыходу да рэчаіснасці, форма Маякоўскага з'яўляецца для яго выходным пунктам да пошукаў уласных шляхоў».

У большасці сваёй вершы, прадстаўленыя ў зборніку, перакладзены па - майстэрску. Г. Врбова паставіла перад сабой удзячную задачу — перакладаць непасрэдна з беларускай мовы і, як прызнаецца сама, «кінулася ў мнагаводную раку паэзіі Панчанкі, не карыстаючыся паромам рускага перакладу і выратавальным поясам падрадкоўніка». Да бясспрэчных удач можна залічыць пераклады вершаў «Асеннім днём», «Пачастунак», «Песня (партызанская)», «Дзеці вайны», «Коні», «Герой», «Тры дні з упартасцю тупаю...», «Маё і тваё маленства», «Ад'езд маладой» і многія іншыя.

Часам, аднак, для перадачы зместу верша Панчанкі перакладчыца знаходзіць другую рытміку, новы памер («Шапка эстонца», «Краіна мая», «Сабе і другім», «Спарышы», «Тост за палярнікаў» і інш.). Цяжка меркаваць, наколькі гэта апраўдана. Сустракаюцца, хоць і рэдка, і моўныя пагрэшнасці (у вершы «Каня хлопец трымаў на тугім павадку», слова «аблокі» перакладчыца зразумела, як «яблыкі», што, вядома, прывяло да парушэння вобразнай сістэмы арыгінала).

Асабліва трэба адзначыць, што Г. Врбова перапрацавала пераклады з П. Панчанкі, ажыццёўленыя ёю раней для анталогіі «Паэты Беларусі» з рускай мовы. У выніку больш дасканала загучалі вершы «Упэўненасць», «Ад'езд маладой», «Пасля дэмабілізацыі».

Не ўпершыню пазнаёміўся славацкі чытач і з І. Шамякіным — яго апавяданні друкаваліся ўжо ў часопісах Славакіі. Пераклад рамана «Крыніцы» выклікаў вялікую цікавасць у самых шырокіх колах чытачоў, бо, як адзначала Марта Лічкава, перакладчыца рамана, «Шамякін ставіць і спрабуе вырашыць мноства вострых актуальных (і ў нас актуальных!) праблем».

«Мы ведаем, — дадае яна далей, — што гэта мудры пісьменнік з чулым сэрцам, які смела і з палкай зацікаўленасцю ўглядаецца ў сённяшні і заўтрашні дзень. У кожным слове адчуваецца, што гэтыя сёння і заўтра з'яўляюцца яго жыццём, што яму хочацца аб гэтым пісаць не толькі як мастаку і ў інтарэсах мастацтва, але ў інтарэсах жыцця, дзеля ажыццяўлення найцудоўнейшых мар аб камунізме. Мы ведаем, што гэта сур'ёзны, сумленны пісьменнік з вялікім пачуццём адказнасці перад чытачом. Ён даў нам цікавы, добры раман, які мае што сказаць кожнаму з нас, даў нам твор, напісаны таленавіта і добрасумленна».

Сведчаннем вялікай цікавасці да кнігі І. Шамякіна з'яўляюцца і шматлікія дыскусіі і канферэнцыі па раману «Крыніцы», якія адбыліся ў многіх мясцінах Славакіі.

Творы беларускіх паэтаў і празаікаў часта сустракаюцца на старонках чэшскіх і славацкіх часопісаў. Вершы Я. Коласа «Гусі» і «Вясна, вясна жаданая» надрукаваў «Слованскі пржэгляд», апавяданне В. Быкава «На возеры» апублікавана ў часопісе «Чцені о Совецкім Свазу». У літаратурна-рэпертуарным дадатку да славацкага часопіса «Людова творывост» («Мастацкая самадзейнасць») рэкамендуюцца для мастацкага чытання апавяданні І. Грамовіча «Бацькава ўпэўненасць» і А. Стаховіча «Марынаўскі пчаляр», перакладзеныя на славацкую мову. У часопісе «Свет сацыялізма» змешчана апавяданне М. Лупсякова «Першая атака».

Актыўным папулярызатарам беларускай літаратуры стаў у Славакіі Георгій Вылчаў, які ў пачатку мінулага года быў госцем Саюза пісьменнікаў Беларусі. У супрацоўніцтве з Г. Вылчавым славацкія паэты Ю. Кокавец, І. Моік і Й. Маернік ажыццявілі пераклады вершаў М. Танка «Жэтон», «Каб ведалі», «Ave Maria», А. Куляшова «Балада ба чатырох заложніках», «Ліст з палону» («Словенске погляды», 1961, № 10), А. Вялюгіна «Паэт», Н. Гілевіча «Я паеду адна», Р. Барадуліна «Бацьку», І. Калесніка «Каторы раз праходжу каля хаты...» («Млада творта», 1961, № 10), Э. Агняцвет «Маладажоны» і Е. Лось «Роздум» («Словенка», 29 ліпеня 1961).

Георгій Вылчаў змясціў у часопісе «Словенске погляды» вялікі артыкул «Беларуская савецкая літаратура», у якім нам здаецца вельмі слушным сцвярджэнне аб тым, што заканамернасці развіцця беларускай савецкай літаратуры неабходна вывучаць у шчыльнай сувязі з агульным развіццём сусветнай літаратуры.

«Шматбаковыя кантакты паміж народамі Савецкага Саюза, іх плённае культурнае ўзаемадзеянне, багаты вопыт савецкай літаратуры побач з уласнымі нацыянальнымі традыцыямі былі добрымі прадумовамі для ідэйна-мастацкага ўзбагачэння беларускай савецкай літаратуры, — піша Г. Вылчаў. — Але не толькі руская і ўкраінская літаратура, не толькі літаратура іншых народаў Савецкага Саюза — уся сусветная культура ўвайшла ў спектр мастацкага жыцця Савецкай Беларусі».

Высокі навуковы ўзровень, добрае веданне беларускай літаратуры адзначаюць артыкул Вацлава Жыдліцкага, прысвечаны разгляду кніг М. Ларчанкі «На шляхах да рэалізму» і «Па шляху рэалізму» («Славія» № 4, 1961).

Радасна бачыць, як развіваецца ўзаемнае азнаямленне, узаемны абмен лепшымі ўзорамі літаратуры паміж народамі Беларусі і Чэхаславакіі, як расце дружба нашых культур. І ў інтарэсах гэтай дружбы было б карысным правядзенне на Беларусі Дзён чэхаславацкай культуры, а ў Чэхаславакіі — культуры беларускай, што прапануе часопіс «Слованскі пржэгляд», які мае паўвекавыя традыцыі прапаганды беларускай літаратуры.

А. МАЖЭЙКА.

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА. Рака Нараўка. Фотаэцюд В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА)

Падзеі. Факты. Навіны

□ У раённых дамах культуры Мядзеля і Вілейкі адбыліся лекцыі-канцэрты на тэму: «Савецкая песня і музыка кіно». Аб развіцці савецкай песні, аб лёгкай эстраднай музыцы савецкіх кампазітараў, аб музыцы савецкага кіно слухачам расказаў музыказнаўца М. Крэер. Заслужаны артыст БССР А. Астрамецкі, артысты В. Зяміраў, Т. Ваняцян, Г. Балацкая, Г. Стэрлін выканалі шэраг твораў І. Дунаеўскага, В. Салаўёва-Сядога, З. Калманоўскага, А. Хачатурана, М. Блантэра, М. Бакалава і іншых кампазітараў.

□ «Музыка ў жыцці Леніна». Лекцыю-канцэрт на гэтую тэму праслухалі слухачы універсітэта культуры Бярэзінскага раённага дома культуры. Аб значэнні музыкі ў жыцці Леніна, аб яго музычных густах і любімых творах прысутным расказаў М. Жухавіцкі. Заслужаная артыстка БССР Т. Пастуніна, артысты В. Цыркуноў, Г. Агніўцава выканалі рускія народныя песні, арыі з опер і рамансы рускіх і заходніх кампазітараў.

□ Днямі ў Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў адбыўся рэспубліканскі семінар кінааматараў, арганізаваны Беларускім саветам прафсаюзаў і Міністэрствам культуры БССР.

Удзельнікі семінара праслухалі лекцыі майстроў беларускага кіно, пазнаёміліся з работай кінастудыі «Беларусьфільм», сустрэліся з работнікамі студыі С. Проніным, М. Фрайманам, прагледзелі кінафільмы, знятыя аматарамі, Мінскі кінааматар В. Грыбаў расказаў пра свой вопыт апрацоўкі фільмаў.

□ У спектаклях Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета прыняў удзел саліст Львоўскага опернага тэатра З. Бабій. Аматары опернага мастацтва сталіцы праслухалі ў яго выкананні партыі Хазэ (опера Ж. Бізэ «Кармэн») і Радамэса (опера «Аіда» Д. Вердзі.)

«ЖЫЦЦЁ» КІНАПЛЁНКІ ПРАДОЎЖАНА

Ці ведаеце вы, колькі «жыве» звычайная 35-міліметровая кінакопія? У сярэднім каля 480 сеансаў. Не так ужо і многа. Прычым так званыя павярхоўныя дэфекты: драпіны, палосы і іншае—гэта яшчэ не галоўнае зло. Яны лёгка ліквідуюцца спецыяльнымі рэстаўрацыйнымі машынамі, якія ёсць амаль ва ўсіх пракатных канторах. Плёнка лічыцца непрыгоднай у тым выпадку, калі ірвецца перфарацыя, г. зн. адтуліны, размешчаныя па краях кінакопіі.

Павышэнне трываласці кінаплёнкі — задача не сённяшняга і не ўчарашняга дня. Яна нарадзілася амаль адначасова з самой кінематаграфіяй. Асноўны яе напрамак — стварэнне новых трывалых матэрыялаў наўзамен сучасных. Аднак гэты спосаб патрабуе вялікіх выдаткаў і стварэння амаль цэлай новай галіны прамысловасці.

Гавораць, што выдатныя ідэі ўвогуле простыя. Але іх трэба ўбачыць, а іншы раз яшчэ і ўмела выкарыстаць. Шмат гадоў назад савецкі вучоны, акадэмік Іофе вытачыў саляную палачку і вымераў яе трываласць. Пасля гэтага ён апусціў яе на кароткі час у звычайную, хімічна чыстую ваду. І што ж: пасля такой «аперацыі» трываласць палачкі павялічылася ў некалькі разоў. Справа ў тым, што на трываласць кожнага матэрыялу асабліва ўплываюць непрыкметныя для вока мікрадэфекты і мікрашчылінкі. Саляная палачка, апушчаная ў ваду, «аплавілася», і мікрадэфекты на яе паверхні нібы зніклі.

Гэты просты і, дарэчы, далёка не новы прынцып узялі за аснову сваёй работы супрацоўнікі фільмавай лабараторыі Усесаюзнага навукова-даследчага кінафотаінстытута (НДКФІ). Яны сканструявалі ўнікальны ў сваім родзе лабараторны ўзор машыны, у якой плёнка, праходзячы праз гарачы барабан, награецца да тэмпературы размякчэння і толькі пры гэтым на ёй штампуецца перфарацыя. Першыя доследы паказалі, што такім спосабам «жыццё» плёнкі падаўжаецца ў два разы.

Распрацоўваецца таксама спосаб награвання інструмента, які сячэ перфарацыю, што павінна даць яшчэ большы эфект. Значнай эканоміі можна дамагчыся шляхам змяншэння таўшчыні плёнкі без зніжэння трываласці перфарацыі. І гэта становіцца магчымым дзякуючы новай арыгінальнай машыне.

АДН.

КАЛІ СПРАВА ПА ДУШЫ

Яшчэ будучы вучнем Касяніцкай сямігадовай школы Крупскага раёна І. Зезюлькевіч зайздросціў прафесіі кінамеханіка. Калі ў вёску прыязджала перасоўка, ён з вялікай цікавасцю разглядаў апаратуру.

Хутка юнак прыйшоў у раённы аддзел культуры.

— Накіруйце мяне ў школу кінамеханікаў.

Пасля заканчэння школы І. Зезюлькевіч вярнуўся ў раён. Яму даверылі кінаперасоўку, вызначылі маршрут. З вялікай актыўнасцю ўзяўся малады механік за справу. Ён з першых месяцаў пачаў дабівацца добрых поспехаў. Перад пачаткам сеанса расказваў, што ў карціне цікавага, раіў, які фільм лепш паглядзець у бліжэйшыя дні. І сельскія працаўнікі ахвотней сталі хадзіць у кіно.

Радасным быў для Івана мінулы год. У сацыялістычным спаборніцтве за лепшае кінаабслугоўванне насельніцтва ён выйшаў на першае месца ў раёне. За высокія паказчыкі І. Зезюлькевічу прысвоілі ганаровае званне ўдарніка камуністычнай працы. Горача павіншавалі маладога кінамеханіка таварышы па працы, сябры.

Такія поспехі ў рабоце кінафікатара сталі магчымымі дзякуючы добрай, прадуманай арганізацыі працы.

Цесную сувязь падтрымлівае кінамеханік з сельскай інтэлігенцыяй. Перад паказам кінакарціны чытаюцца лекцыі, даклады, праводзяцца гутаркі. Напрыклад, у апошні час пры паказе фільмаў лекцыі чыталі настаўнікі В. Малашчанка, С. Балабаеў, В. Шамлет, Е. Прышчэпава.

Дзесяць гадоў штодзённа едзе ад вёскі да вёскі з кінаперасоўкай Іван Сяргеевіч Зезюлькевіч.

— Для мяне няма працы лепшай і больш ганаровай, — гаворыць кінамеханік.

М. ПРЫС.

СМАЛЕНСКІЯ АРТЫСТЫ Ў ГОМЕЛІ

На гастролі ў Гомель прыехаў калектыў Смаленскага дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Тэатр прабудзе ў Гомелі месяц. За гэты час ён пакажа працоўным абласнога цэнтра спектаклі А. Ліпоўскага «Гранада мая», А. Штэйна «Акіян», С. Алешына «Пункт апоры», І. Лазуціна «Сержант міліцыі», Р. Назарава «Выпадковыя сустрэчы» і інш. Апроч таго, смаленскія артысты выступяць са сваімі лепшымі спектаклямі на сцэнах заводскіх і калгасных палацаў культуры.

Ф. ЗАЙЦАЎ.

БІБЛІЯТЭКАРЫ ВУЧАЦЦА

Закончылі работу месячныя курсы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў Мінска. Для 25 бібліятэкараў былі прачытаны лекцыі па пытаннях методыкі культасветработы, прапаганды кнігі, а таксама праведзены з імі практычныя занятні па складанню каталогаў, правядзенню канферэнцый чытачоў, літаратурных вечароў і іншых форм масавай работы.



НА ВЯСНОВЫХ ЭЦЮДАХ. Фота І. ШЫШКО.

ПЕРШЫ КРОК

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Але жанчыну зусім не здавальняў такі адказ. Цяжка дыхаючы, яна ступіла наперад і пільна паглядзела на Рынглера.

— Не, доктар, — настойліва прашаптала яна. — Вы не можаце адмовіцца. Вы не павінны браць на сваё сумленне такую нізасць!— калоцячыся ад хвалявання, яна сцяла кулакі і прыціснула іх да падбародка. Зубы яе стукалі як у ліхаманцы. — Ён сыходзіць крывёю, доктар! Сыходзіць крывёю... — прастагнала яна. — Вы ведаеце яго. Зараз яго прынясуць сюды. Уся надзея толькі на вас!.. — жанчына апусціла рукі, яе твар неяк раптам паспакайнеў: — Таму што мы ведаем: у душы вы заўсёды былі на нашым баку.

— Вы памыляецеся! Я не стаю ні на чым баку! — сказаў ён, рэзка ўзняўшы руку. Потым дадаў: — Бо няма цяпер другога боку, бо ўсё цяпер зламана.

Вочы жанчыны запалалі гневам. Доктар Рынглер хацеў быў ужо сказаць сваё рашучае «не», як яго позірк трапіў на мужчыну, што стаяў ззаду жанчыны, прысланіўшыся да сцяны; спрачаючыся, яны абое не заўважылі, што дзверы бясшумна адчыніліся і пасля зачыніліся зноў.

Сіняе святло лямпачкі падала на квадратны твар з рэзкімі абрысамі, з-пад насунутай на лоб шапкі блішчалі шкельцы акуляраў. Вейкі мужчыны былі амаль заплюшчаны, рот моцна сцяты. Вопытны позірк урача адразу вызначыў небяспеку — чалавек страціў шмат крыві. І адначасова Рынглер адчуў, як халодная рука, што сціскала яму сэрца, паціху павярнулася, сціскаючы яго яшчэ мацней. Ён з першага ж позірку пазнаў яго — былога дэпутата гарадскога магістрата, які доўгі час быў у турме, а цяпер знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

Памагчы яму — азначала трапіць у лік «ворагаў дзяржавы». Рынглер міжволі адхіснуўся.

Мужчына, з цяжкасцю выпрастаўшыся, падтрымліваючы здаровай рукой параненую, ступіў насустрач доктару.

— Маё жыццё ў вашых руках, доктар.

Напружаная цішыня запанавала ў асветленым сінім святлом пакоі. Толькі чуваць было мернае цікане гадзінніка. Рынглер прыкусіў губу так, што адчуў на языку салянаваты смак крыві. Голас мужчыны, які раптам абарваў цішыню, прагучаў больш цвёрда і нават загадна:

— Сюды мяне прывялі мае сябры, і вам давядзецца адказваць.

— Вы пагражаеце? — голас Рынглера гучаў прыглушана.

— Толькі ў выпадку, калі гэта будзе неабходна, доктар. Пакуль што такой неабходнасці няма.

Мужчыны так блізка сышліся, што глядзелі адзін аднаму проста ў вочы — рослы, шыракаплечы рабочы і тонкі, выпешчаны доктар. Нечакана жанчына рашуча ступіла наперад і стала паміж імі.

— Хіба цяпер час спрачацца? Цяпер патрэбна дапамога. Неадкладная дапамога! Вы ж чалавек, доктар.

Усё яшчэ вагаючыся, Рынглер правёў рукой па твары, пасля выпрастаўся і, паказаўшы жэстам, каб яны ішлі за ім, адчыніў дзверы свайго прыёмнага пакою.

У пакоі Рынглер, падышоўшы да ўмывальніка, пачаў старанна мыць рукі, нібы рыхтаваўся да сур'ёзнай аперацыі. На самай справе яму хацелася выйграць час, сабрацца з думкамі, каб не зрабіць памылкі, калі пры яркім святле лямпы ён гляне ў твар гэтаму прадстаўніку старой тэльманаўскай гвардыі.

Павярнуўшыся да наведвальнікаў, доктар убачыў, што ранены ўжо сядзеў на маленькім круглым крэсле, жанчына паспела зняць з яго паліто і куртку. Грубая кашуля пад левым плячом прамокла цёмна-чырвонай крывёю. Рынглер агледзеў рану. Хуткімі мяккімі рухамі адчыніў шафу, дзе ляжалі інструменты, узяў нажніцы, асцярожна распароў кашулю і пінцэтам зняў прыкарэлыя да краёў раны ніткі.

— «Сыходзіць крывёю!..» Глупства! Ад гэтага яшчэ ніхто не паміраў. Але... паўсантыметра направа і я быў бы вызвалены ад гэтай гісторыі...

Выняўшы з банкі стэрыльныя тампоны, ён выцер імі кроў, што цякла з раны.

— Але пра кожнае вогнестрэльнае раненне трэба неадкладна заявіць. Вы, вядома, ведаеце гэта...

— Рынглер скоса глянуў на жанчыну, пасля — на перакрыўлены ад болю твар мужчыны. — Я абавязаны гэта зрабіць.

Жанчына сачыла за кожным рухам доктара.

— Ні пра што вы не будзеце заяўляць, доктар! — твар рабочага ажывіўся. — Нічога вы не скажаце. І самі ведаеце чаму!

Здзіўлены гэтым упэўненым тонам, Рынглер узняў вочы. У люстэрку над умывальнікам ён бачыў твар чалавека, чыё жыццё было ў яго руках. Але гэты чалавек патрабаваў, каб ён, доктар Рынглер, паставіў на карту і свой лёс.

— Кулявое раненне ў ваенны час, пры зацямненні, у час паветранага налёту... Вы ведаеце, што мяне чакае, калі я не паведамлю пра гэта?.. Ды яшчэ, калі ўспомняць маё мінулае, што я быў старшынёй акруговай Лігі правоў чалавека? — ён паклаў на абедзве кулявыя раны мяккія стэрыльныя падушачкі. — Вы, канешне, зноў распаўсюджвалі камуністычныя лістоўкі? — Рынглер глянуў у люстэрка, каб праверыць, якое ўражанне зрабіла гэтае пытанне.

Ранены маўчаў.

— Толькі дарэмна рызыкуеце і сваім жыццём, і жыццём другіх.— Рынглер паклаў нажніцы на столік. — Вы ваюеце з ветракамі...

— Вы так думаеце? — паранены ўсміхнуўся. — Хутка вы зразумееце, што гэта не так...

Паківаўшы галавою, Рынглер зноў нахіліўся над ранай. Рабочы маўчаў. Перад вачыма доктара зноў паўстала сцэна з карціны Кетэ Кольвіц. Гэты хлопец з яго шырокімі плячыма падобны быў да аднаго з тых, хто быў у натоўпе скаваных сялян. Але хіба ён, доктар Рынглер, не быў падобны да мастачкі, якая бачыла сябе там — у натоўпе?..

Ён думаў пра гару Родэнберг, пра эшафот, пра няскораны паглядзеў правадыра паўстанцаў, які той кідаў нават тады, калі яго падвялі да дыбы. Ён то не змірыўся! Ён не здрадзіў з-за страху сваім перакананням! Гарачае пачуццё ахапіла Рынглера. А хіба ён не здольны на смелы ўчынак? Доктар паглядзеў на шырокія плечы чалавека, які сядзеў перад ім. Няўжо для гэтага абавязкова трэба мець моцныя мускулы і быць рабочым?

«Хто можа перашкодзіць мне выканаць мой абавязак доктара і чалавека? — думаў Рынглер. — Хто можа прымусіць мяне выдаць гэтага хлопца гестапа?»

Радаснае пачуццё, што абудзілася ў ім, станавілася ўсё мацнейшым. Ды не трэба яму прымаць нейкае асаблівае рашэнне! Проста ў яго, як у прыстойнага чалавека, ёсць толькі адзін шлях і трэба па ім ісці, нават калі пагражае небяспека. І нечакана ў цішыні зноў прагучаў голас чалавека з магутнымі плячыма, рабочага з млына, які прывык цэлы дзень цягаць цяжкія мяхі з мукою:

— Не, доктар, я ўсё ж хачу вам сказаць — сёння мы не распаўсюджвалі лістовак. На гэты раз не. Вы можаце быць зусім спакойны.

Адарваўшыся ад сваіх думак, Рынглер здзіўлена паглядзеў на пацыента, які добразычліва ўсміхаўся.

— Толькі наш абавязак выконвалі сёння мы, доктар. Просты, чалавечы абавязак перад галоднымі, змучанымі людзьмі. Мы насілі ім хлеб — звычайны чорны хлеб. А каб спячы яго, мы ўкралі муку. Вы бачыце, я цалкам аддаю ў вашы рукі і сябе, і сваіх таварышаў... Так, мы пяклі хлеб і адносілі яго ў лагер рускім ваеннапалонным...

Доктар нізка схіліўся над павязкай, быццам правяраў, ці добра яна пакладзена. Ён не хацеў, каб гэтыя двое бачылі, што твар яго пачырванеў.

Трошкі памаўчаўшы, рабочы гаварыў далей:

— Мы натрапілі на эсэсаўскі патруль і па нас адкрылі страляніну, нібы па зайцах. Вы, безумоўна, ведаеце, чаго можна было чакаць ад гэтых малойчыкаў. Нас выратаваў туман.

Доктар адышоў да ўмывальніка і паглядзеў у люстэрка. Цёмныя вочы яго ўзрушана блішчалі. Ён не заўважаў, што тыя двое пільна наглядалі за ім і крадком кіўнулі адзін аднаму.

— Рана не пагражае жыццю,— сказаў Рынглер, павярнуўшыся да іх. Ён дастаў шпрыц, не спяшаючыся напоўніў яго, уважліва агледзеў іголку і памаленьку націснуў на шток, пакуль з іголкі не паказаліся першыя кроплі. — Куля ледзь не закранула падключычную артэрыю. Магло скончыцца дрэнна. Я зраблю цяпер супрацьстаўбнячны ўкол. Самае мала тыдзень давядзецца ляжаць у пасцелі.

— Немагчыма, доктар, зусім немагчыма, — у голасе раненага з'явіліся металічныя ноткі.—Вы ж ведаеце, што раніцай я павінеч быць на рабоце, інакш мяне зараз жа забяруць.

— Ну, гэта ўжо не мой клопат, паціснуў плячыма Рынглер. — Як доктар я абавязаны вас папярэдзіць, што вам неабходна тыдзень праляжаць у пасцелі. З гэтым давядзецца мірыцца, калі не хочаце, каб было горш.

— Сама найгорш будзе, калі мяне схопіць гестапа. — Рабочы нават не здрыгануўся, калі доктар укалоў іголкай. — Але што-небудзь прыдумаем... Мне прыйдзецца паклапаціцца, каб раніцай са мною адбыўся «няшчасны выпадак».

Усё яшчэ трымаючы ў руках шпрыц, Рынглер падумаў, ці павінен ён ісці далей. Ён вагаўся. У тым, што ён аказаў першую дапамогу, яшчэ можна было неяк апраўдацца, але... ці можна адно аддзяляць ад другога? Ён дапытліва зірнуў на двух мужных людзей у пакоі. Твар жанчыны страціў напружаны выраз і нават папрыгажэў. Радасна ўсміхаючыся, яна асцярожна накрыла плечы раненага ягонай курткай. Мужчына быў сур'ёзны. Відаць было, што ён ніколі не вагаўся, ідучы сваім нялёгкім шляхам.

— Сказаць дзякуй за тое, што вы памаглі нам сёння, — гэта вельмі мала. Вам не давядзецца шкадаваць, — апошнія словы паранены вымавіў з нейкай асаблівай інтанацыяй і цяжка ўстаў з крэсла.

Рынглер асцярожна паклаў інструменты і рашуча павярнуўся да рабочага. Упершыню за ўвесь час на твары доктара з'явіўся энергічны выраз, а голас прагучаў упэўнена і цвёрда.

— Не, Вульф! — у першы раз ён назваў свайго пацыента па імені. — Цяпер гэта ўжо не ваша, а наша справа. На гэта было цяжка рашыцца, але, калі ты ўжо ступіў першы крок, дык больш стаяць на месцы нельга, — на вуснах Рынглера з'явілася добрая ўсмешка.

Доктар паглядзеў на жанчыну, якая, стаміўшыся ад вялізнага напружання гэтай ночы, зняможана апусцілася на крэсла, і працягваў, звяртаючыся да Вульфа:

— Не ідзіце на работу! Заставайцеся раніцай дома. У вас нырачныя болі, разумееце? Я — ваш лекар. Медыкаменты, што я вам прапішу, пастаўце каля свайго ложка... У астатнім жа маё прадпісанне такое — строгі рэжым: ляжаць у ложку на працягу сямі дзён...

Калі познія наведвальнікі доктара Рынглера пайшлі ад яго, ён яшчэ доўга стаяў у сваім рабочым пакоі. Думаў.

Стары гадзіннік сярэбраным боем паведаміў, што поўнач даўно мінула. Пачынаўся новы дзень.

Пераклаў з нямецкай мовы **С. КУВАЕЎ.**

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры — 3-20-54, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры— 3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 13105

Друкарня выдавецтва «Звязда».